

У. А. Арлоў

# АСВЕТНІЦА З РОДУ УСЯСЛАВА

## Ефрасіння Полацкая

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1989

ББК 63.3(2)43
А 82

В популярной форме рассказывается о просветительнице, одной из самых образованных женщин своего времени в Европе — Ефросинии Полоцкой (около 1110—1173). Постригшись в юности в монастырь, княжна Прадслава-Ефросиния не пряталась за его стенами — открывала школы и скриптории, собирала и опекала таланты, активно участвовала в общественно-политической и культурной жизни Полоцкого княжества. Деятельность просветительницы подается на фоне ее драматической и противоречивой эпохи.
Для широкого круга читателей.

Навуковы рэдактар
доктар гістарычных навук А. П. Грыцкевіч

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук А. А. Трусаў,
кандыдат філалагічных навук В. А. Чамярыцкі,
навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР С. В. Тарасаў

*На франтыспісе — Ефрасіння Полацкая. Малюнак паводле гравюры XIX стагоддзя са старажытнага образа.*

**Арлоў У. А.**
А 82 Асветніца з роду Усяслава: **Ефрасіння Полацкая.—Мн.: Навука і тэхніка, 1989.—53 с, [8] л. іл.—(Нашы славутыя землякі).**
**ISBN 5-343-00602-7.**
**Орлов В. А. Просветительница из рода Всеслава: Ефросиния Полоцкая.**

У папулярнай форме апавядаецца пра асветніцу, адну з самых адукаваных жанчын Еўропы XII стагоддзя Ефрасінню Полацкую. Пастрыгшыся ў юнацтве ў манастыр, яна не хавалася за яго сценамі — адчыняла школы і скрыпторыі, была збіральніцай і апякункаю талентаў, брала чынны ўдзел у грамадска-палітычным і культурным жыцці Полацкага княства.
Для шырокага кола чытачоў.

А $\frac{0603020200-165}{М316(03)—89}$ 175-90 ББК 63.3(2)43+87.3(2)

ISBN 5-343-00602-7
© Выдавецтва «Навука і тэхніка», 1989

# ПРАДМОВА

Ефрасіння Полацкая. Без гэтага імя немагчыма ўявіць не толькі панараму духоўнага жыцця на ўсходнеславянскіх землях у XII стагоддзі, але і ўсю гісторыю беларускай культуры. Князёўна, ігумення, ды найперш выдатная асветніца, пра якую «Жыціе»* кажа, што яна — «небопарный орел, попаривши от Запада и до Востока, яко луна солнечная, просветивши всю землю Полоцкую», Ефрасіння пакінула па сабе глыбокую памяць у душы народа.

Паміж намі і часам, калі жыла славутая палачанка, ляжыць больш за восем стагоддзяў. Не дзіва, што гісторыя захавала пра яе не надта багатыя звесткі, але і яны дазваляюць убачыць агульнаеўрапейскую значнасць асобы таленавітай жанчыны-падзвіжніцы. Ахвярная праца Ефрасінні, як і яе сучаснікаў Кірылы Тураўскага ** і Клімента Смаляціча ***, сведчыць пра высокі культурны ўздым на зямлі нашых продкаў.

Ужо ў юнацтве Ефрасіння перапісвала і перакладала з іншых моваў кнігі. Пазней, заснаваўшы ў Полацку два манастыры, яна надала. пашырэнню пісьмовага слова вялікі размах. Вельмі верагодна, што асветніца і сама пісала арыгінальныя творы. Некаторыя гісторыкі небеспадстаўна звязваюць з імем Ефрасінні полацкае летапісанне і заснаванне бібліятэкі Сафійскага сабора, страчанай у гады Лівонскай вайны. Важнае месца ў жыцці нашай

* *Жыціе Ефрасінні Полацкай // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн., 1959. С. 68—81.*
** *Кірыла Тураўскі (каля 1130 — каля 1182) — славуты пісьменнік, прапаведнік, майстар прамоўніцкай прозы.*
*** *Клімент Смаляціч (? — пасля 1164)—пісьменнік, мысліцель, царкоўны дзеяч.*

землячкі належала педагагічнай дзейнасці. Ефрасіння рупілася, каб вучні манастырскіх школ разам з граматаю навучаліся «чистоте душевней и бестрастию телесному».

Знаходзячыся ў цэнтры культурнага жыцця тагачаснай Полацкай зямлі, асветніца выступала ў ролі збіральніцы талентаў, своеасаблівай мецэнаткі. Па яе заказе дойлід Іаан пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса, якую лічаць дасканалым узорам полацкай архітэктурнай школы. Мясцовы майстар-ювелір Лазар Богша зрабіў для Ефрасінні свой славуты крыж—неацэнны помнік старажытнабеларускага ўжытковага мастацтва. Яна спрыяла стварэнню унікальных фрэскавых размалёван Спаскага храма.

Вялікім быў уплыў князёўны-ігуменні на палітыку Полацка. Яна ўздымала свой голас супроць княскіх усобіц, папярэджвала, што братазабойчыя войны могуць прывесці Радзіму да гібелі. Прыклад асветніцы натхняў яе землякоў і наступнікаў Францішка Скарыну, Васіля Цяпінскага, Сымона Полацкага...

Чаму ж мы амаль не сустрэнем згадак пра дзейнасць Ефрасінні ў музейных экспазіцыях і ў школьных падручніках па гісторыі Беларусі? Чаму маўчыць пра яе і пяцітомная акадэмічная «Гісторыя БССР»?

Як вядома, дзеля ўмацавання свайго аўтарытэту царква няраз абвяшчала выдатных дзеячаў гісторыі і культуры святымі (напрыклад, князя Аляксандра Неўскага). Так здарылася і з Ефрасінняй. Яна стала адной з першых кананізаваных жанчын на ўсходнеславянскіх землях. Зразумела, што ў перыяд панавання ў гістарычнай навуцы вульгарна-сацыялагічных схем, водгулле якіх чуваць і сёння, факт кананізацыі асветніцы быў вялікай перашкодаю ў пашырэнні праўдзівых звестак пра яе. Дзейнасць славутай палачанкі доўгі час ацэньвалася аднабакова і няправільна (Ефрасінню абвяшчалі выключна рэлігійнай дзяячкай або нават цемрашалкаю) ці наогул замоўчвалася.

У 70—80-я гады беларускія гісторыкі, а таксама пісьменнікі, мастакі, журналісты нямала зрабілі,



каб зняць з імя Ефрасінні недарэчныя ярлыкі і вярнуць яго ў нашу гістарычную свядомасць. Сярод публікацый, прысвечаных жыццю і дзейнасці асветніцы, найперш трэба назваць артыкул М. І. Ермаловіча *. Звесткі пра яе падае і «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» **.

Абсягі шматграннай дзейнасці Ефрасінні Полацкай былі такія шырокія, што яна выйшла за межы інтарэсаў пануючага класа, значна апярэдзіла свой час і набыла агульнанароднае значэнне і прызнанне.

Асноўная крыніца біяграфічных звестак пра асветніцу — яе «Жыціе». Гэта арыгінальны помнік старажытнабеларускай літаратуры, адзін з самых ранніх твораў гістарычнай прозы на Беларусі, які быў створаны невядомым аўтарам у Полацку на мяжы XII—XIII стагоддзяў ***. «Жыціе» дайшло да нас, прынамсі, у шасці рэдакцыях, прадстаўленых болей чым 100 спісамі, самы даўні з якіх належыць да XVI ст. Шэраг гэтых спісаў захоўваецца ў Публічнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе.

«Жыціе Ефрасінні Полацкай» напісана царкоўнаславянскай мовай старажытнаўсходнеславянскай рэдакцыі. Яно пачынаецца рытарычным уступам, потым ідзе аповяд пра жыццёвы шлях святой як пра духоўнае ўзыходжанне. Асаблівасцямі «Жыція» з'яўляюцца спроба аўтара паказаць характар гераіні, амаль поўная адсутнасць звычайных для твораў гэтага жанру расказаў аб пасмяротных дзівосах. Апавяданне грунтуецца на сапраўдных гістарычных фактах, прычым падзеі падаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці. Змешчаныя ў «Жыціі» маналогі і дыялогі дазваляюць раскрыць унутраны свет падзвіжніцы. З гісторыка-мастацкай біяграфіяй гераіні спалучаюцца іншыя

** Ермаловіч М. Яко луна солнечная // Полымя. 1973. №8.*

*** Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусь. Т. 2. С. 420.*

**** Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. 1. Мн., 1968. С. 74.*

літаратурныя жанры: хаджэнне (апісанне падарожжа ў «святую зямлю») і пахвала. Самая пашыраная рэдакцыя «Жыція» — чацвертая, дзе падаецца генеалогія роду Ефрасінні *.

Некаторыя гістарычныя рэаліі і цікавая інфармацыя пра асветніцу і яе светапогляд ёсць таксама ў знойдзеным нядаўна спеўным цыкле пра Ефрасінню **.

** Звесткі пра публікацыі і даследаванні «Жыція Ефрасінні Полацкай» гл. у кн. «Словарь книжников и книжности Древней Руси». Вып. 1. Л., 1987. С. 147—148.*

*** Серёгина Н. С. Певческий цикл о Ефросинье Полоцкой — памятник XII века // Конференция «История и археология Полоцка и Полоцкой земли». Полоцк, 1987. С. 52—53.*

# КАЛЫСКА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

*Полацкая дзяржава * Бацька гарадоў нашых * Асяродак кніжнае навукі * Памяткі даўніны * Адметнасць полацкай культуры*

Радзіма Ефрасінні — Полацкае княства, модная раннефеадальная ўсходнеславянская дзяржава, якой два з паловаю стагоддзі кіравала самастойная дынастыя Рагвалодавічаў, або Ізяславічаў (калі лічыць ад унука Рагвалода і сына Рагнеды князя Ізяслава).

У Падзвінні ў другой палове першага тысячагоддзя адбывалася ўзаемадзеянне плямён крывічоў, дрыгавічоў і балтаў, што паклікала да жыцця новае этнічнае ўтварэнне — палачанаў. Па тэрыторыі княства, злучаючы Арабскі халіфат і Хазарыю з усходнімі славянамі і Скандынавіяй, праходзілі старадаўнія гандлёвыя шляхі. Выгоднае геаграфічнае становішча разам з інтэнсіўнымі этнічнымі працэсамі і былі галоўнымі фактарамі хуткага ўзвышэння Полацкай зямлі. У XII стагоддзі яна па сва-й тэрыторыі была роўная такім буйным тагачасным заходнееўрапейскім дзяржавам, як герцагства Баварскае і каралеўства Партугальскае *. Васаламі Полацка былі размешчаныя ў балцкіх землях гарады Герцыка (Герцыке), Куканос (Кукенойс). Даніну яму плацілі плямёны ліваў і летаў, якія жылі ніжэй па Дзвіне. Полацкія свецкія і духоўныя валадары заўсёды праяўлялі да сваіх даннікаў-язычнікаў верацярпімасць. Відаць, тэта было вышкам моцных пазіцый дахрысціянскай ідэалогіі і ў самім княстве.

** Алексеев Л. В. Полоцкая земля. М., 1966. С. 67.*

Сведчаннем палітычнай стабільнасці Полацкай зямлі з'яўляецца тое, што цэлае стагоддзе ёю кіравалі толькі два князі: Брачыслаў Ізяславіч (1001—1044) і ягоны сын Усяслаў Чарадзей (1044—1101). Пры Усяславе княства дасягнула свайго найвышэйшага ўздыму. У тэты час быў пабудаваны Сафійскі сабор, трэці такі храм на ўсходнеславянскіх землях, які сімвалізаваў роўнасць Полацка з Кіевам і з Ноўгарадам. Дзяржаўны розум і патрыятызм полацкага князя ўславіў геніяльны аўтар «Слова пра паход Ігаравы»: «Всеслав князь людем судяше, князем грады рядяше... великому Хръсови* влъком путь прерыскаше. Тому въ Полотске позвониша заутренюю рано у святыя Софеи въ колоколы, а он въ Кыеве звон слыша». Між іншым, гэты князь стаў правобразам быліннага Волха Усяславіча.

Пра міжнародны аўтарытэт Полацкай зямлі кажа блізкае сваяцтва Рагвалодавічаў з домам візантыйскіх імператараў Комнінаў. Дачка Усяслава Чарадзея была жонкаю кесара Аляксея.

Палітычным і эканамічным сэрцам княства, што стала гістарычнай прарадзімаю беларусаў, быў Полацк, адзін з самых старажытных усходнеславянскіх гарадоў, які ўпершыню прыгадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 862 годам. У XI — XII стагоддзях тут квітнеюць гандаль і рамёствы. Уніз па Дзвіне, а затым па Варажскім моры полацкія купцы вязуць воск, мёд і футра. На мясцовым торжышчы можна сустрэць гасцей не толькі са старажытнарускіх гарадоў, але і з Візантыі, Прыбалтыкі. Археолагі налічваюць дзесяткі спецыяльнасцяў полацкіх майстроў. Развітымі былі кавальскае і ліцейнае рамяство, ганчарства, гарбарства і шавецтва. Сваімі вырабамі славіліся збройнікі і ювеліры, якія валодалі многімі прыёмамі апрацоўкі каляровых і высакародных металаў — каваннем, чаканкаю, цісненнем, філігранню, зерню.

Тагачасны Полацк з яго манастырамі і цэрквамі, з заснаванай каля 1000 года епіскапскай кафедрай — буйны асяродак кніжнае навукі. Ніканаўскі летапіс невыпадкова паведамляе пра полацкага князя Ізяслава (памёр у 1001 годзе), што ён «прилежаша прочитанию» кніг. Доўгі час (пакуль не быў знойдзены вядомы Гнёздаўскі надпіс) пячатку з імем гэтага князя-кніжніка лічылі самым даўнім узорам пісьменства Старажытнай Русі. Дарэчы, да нашых дзён дайшла знойдзеная на Рурыкавым гарадзішчы ў Ноўгарадзе пячатка самой Ефрасінні (захоўваецца ў фондах Наўгародскага гістарычна-археалагічнага запаведніка). У Полацку вялі летапіс, урыўкі з яго захаваліся да XVIII стагоддзя і трапілі ў так званы Яропкінскі спіс, якім карыстаўся рускі гісторык В. М. Тацішчаў. Пра высокі для таго часу ўзровень пісьменнасці кажуць таксама графіці * полацкіх храмаў, каштоўныя помнікі эпіграфікі «Барысавы камяні». Нядаўна надпіс сярэдзіны XI стагоддзя выяўлены на вялікім камені, што знаходзіўся ў падмурку Сафійскага сабора. Магчыма, знойдзены «аўтограф» старажытных дойлідаў. Цікава, што ў помніках пісьменства Полацкай зямлі часта сустракаецца дзесяцярычнае «і» **. Гэта сведчыць пра веданне палачанамі лацінскага алфавіту.

На працягу большай часткі сваёй гісторыі Полацкае княства захоўвала незалежнасць ад Кіева. Вядома, гэта не азначала адарванасці Полацка ад суседніх земляў, з якімі ён заўсёды меў цесныя дзяржаўныя, гандлёвыя і культурныя сувязі. Разам з тым самастойнасць, апрача палітычных і эканамічных выгадаў, давала большую творчую свабоду мясцовым дойлідам, жывапісцам, іншым талентам, якім не трэба было абавязкова арыентавацца на кіеўскія ўзоры. Такія ўмовы спрыялі развіццю культуры з цэлым шэрагам адметных рысаў, У Полацку сфармавалася свая школа дойлідства, якая зрабіла значны ўплыў на развіццё архітэктуры ў суседніх усходнеславянскіх землях, асабліва

** Хорс — у міфалогіі ўсходніх славян бог сонца, апякун земляробства.*

** Графіці (ад італ. graffiti — надрапаныя)—старажытныя надпісы, зробленыя вострымі рэчамі на сценах будынкаў.*

*** Назва дзесятай літары кірылічнага алфавіту, якая ва ўсходнеславянскім і старабеларускім пісьме азначала таксама лік 10.*

ў Смаленскім княстве. Ацалелыя фрэскі Спаскай царквы Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, размалёўкі старажытных храмаў Бельчыцкага манастыра (былі даследаваныя, але да нашых дзён не захаваліся), творы ўжытковага мастацтва сведчаць пра творчую самабытнасць і незалежнасць полацкіх мастакоў.

Усё гэта разам з адметнасцямі ідэалогіі дае падставы называць Полацкую зямлю не толькі прарадзімаю беларусаў, але і калыскаю будучай беларускай культуры.

Тут, на берагах Дзвіны і Палаты, у Полацку або ў адной з блізкіх княжых вотчын, каля 1110 года і з'явілася на свет дзяўчынка, якой наканавана было далучыць да свайго імя назву роднага горада, далёка праславіць яго сваім духоўным подзвігам і назаўсёды застацца ў гісторыі.

# СТАРОНКІ ЖЫЦЦЯ

*Унучка Усяслава * Гісторыя ў сямейных паданнях * У бацькоўскім доме * Хрыстова нявеста * Апошняе падарожжа * Уступка султана Саладзіна * Легенда пра князёўну Праксэду*

Будучая асветніца нарадзілася ў сям'і князя Святаслава-Георгія, малодшага сына Усяслава Чарадзея. Дзяўчынку назвалі старажытным полацкім імем Прадслава. З маленства яна чула ад бацькоў паданні пра знакамітых продкаў. У свядомасць юнай князёўны рана ўвайшло імя непакорлівай Рагнеды, якую Уладзімір Краснае Сонейка сілай зрабіў сваёй жонкаю, але не здолеў зламаць яе волі і мусіў адправіць з малым сынам Ізяславам назад на радзіму. Прадславу вабіла і легендарная асоба дзеда Усяслава. Бітва на Нямізе *, палон і вязніца, паўстанне**, калі кіяўляне «пракрычалі» Усяслава вялікім князем, яго вяртанне ў родны Полацк і працяг барацьбы з Кіевам — згадкі пра ўсе гэтыя падзеі не толькі абуджалі ў князёўны цікавасць да мінулага, але і давалі яскравыя прыклады адданасці сваёй зямлі.

Вучылася Прадслава ў школе пры Сафійскім саборы або дома, пры княжым двары (гэта больш верагодна). Навука давалася ёй значна лягчэй, чым аднагодкам: «Жыціе» адзначае любасць дзяўчынкі да вучэння і яе вялікія здольнасці. Княская дачка мела шырокі доступ да кніг. Ужо ў бацькоўскім доме, апрача набажэнскай і іншай рэлігійнай літаратуры, Прадслава магла чытаць «Ізборнікі» з афарызмамі і выслоўямі, перакладзены з грэчаскай

* *Бітва Усяслава з войскам князёў Яраслававічаў, якая адбылася ў 1067 годзе.*

** *Паўстанне 1068 года ў Кіеве.*

мовы раман пра подзвігі Аляксандра Македонскара — «Адёксандрыю», вострасюжэтную «Аповесць пра Акіра Прамудрага»... Пазней іх замянілі кнігі, што давалі багаслоўска-схаластычнае апісанне прыроды, знаёмілі з антычнай гісторыяй.

Дзяцінства князёўны праходзіла, вядома, не толькі ў бацькавым хораме. Яе прыцягвала шматгалосае і шматмоўнае торжышча, дзе можна было пачуць гусляра, пабачыць выступленні «вясёлых людзей» — скамарохаў. Прадслава заходзіла да гандляроў і рамеснікаў, што жылі на пасадзе. Пасля цесных курных хацін простага люду асабліва ўражвалі дзяўчынку полацкія бажніцы і найперш велічны Сафійскі сабор з яго багатымі фрэскавымі размалёўкамі.

Ад карміліцы, нянек, ад маці — княгіні Сафіі яна чула казкі, абрадавыя песні, замовы і закляцці. Своеасаблівае двоеверства існавала на Полаччыне нават у княжацка-дружынным асяроддзі, а значыць, Прадслава добра ведала язычніцкі пантэон*. Яна была глядачкай, а магчыма, і ўдзельніцай гуканняў вясны, русалляў, купалляў, калядаў і іншых дахрысціянскіх святаў.

Слава аб прыгажосці і адукаванасці Прадславы разнеслася «по всем градам», і ў Полацк да князя Святаслава-Георгія зачасцілі сваты. «Жыціе» паведамляе, што, калі князёўне споўнілася дванаццаць гадоў (з такога ўзросту дзяўчынку ў той час пачыналі лічыць нявестай), бацькі вырашылі аддаць яе замуж за сына нейкага слаўнага багаццем і княжэннем валадара. Наперадзе ў Прадславы быў звычайны для жанчыны яе кола лёс: нараджэнне і выхаванне дзяцей, гаспадарчыя клопаты, чаканне свайго гаспадара-князя з паходу або з ловаў... І тут нечакана для блізкіх яна выбірае іншую пуцявіну. «Наполнишись мысли ея, — гаворыцца ў «Жыціі»,— и рече въ себе: «Но что успеша при нас бывшии родове наши? И женишася, и посягоша <выходзілі замуж), но не вечноваша. И житие их мимо тече. Слава их погибе, яко прах, и хужьши паучины... А другыя паче железу выя <шыя> своя

* *Усе багі якога-небудзь культу.*



не преклониша, но духовным мечем отсекоша от себе плотскиа сласти... то ти суть памятни на земли». Прадслава прыходзіць у манастыр. Яе цётка, удава князя Рамана Усяславіча, якая была ігуменняй, «не хотящи острищи ея... и воздохнувши, и прослезившися глагола къ ней: «Чадо мое! Како могу се сотворити? Отец твой, уведав, со всяцем гневом возложить вред на голову мою. А еще юна еси возрастом. Не можеши понести тяготы мнишеского житиа. И како можеши оставити княжение и славу мира сего?» Тым не менш Прадслава дамагаецца свайго і пад імем Ефрасінні таемна ад бацькоў прымае пострыг.

Прычынамі гэтага ўчынку «Жыціе» ў адпаведнасці з асаблівасцямі жанру называе любасць князёўны да бога і жаданне зрабіцца Хрыстовай нявестаю, якое з малых гадоў жыло ў дзяўчынкі ў сэрцы. Але такога тлумачэння яўна недастаткова. Як вядома, Ефрасіння не хавалася за манастырскімі сценамі ад свецкіх клопатаў, а, наадварот, брала чынны ўдзел і ў культурным, і ў палітычным жыцці Полацкай зямлі. Думаецца, ёсць усе падставы казаць, што Ефрасіння адважылася на свой ахвярны крок ужо пасля таго, як прыняла рашэнне паслужыць асвеце роднай зямлі. Яна выдатна разумела, што ў «міру» магчымасці для гэтай працы вельмі абмежаваныя.

Была хутчэй за ўсё і яшчэ адна важная акалічнасць, якая паскорыла пастрыжэнне — суровая неабходнасць пазбегнуць высылкі на чужыну. У 1129 годзе (паводле іншых звестак — у 1128) за адмову ісці ў паход на полаўцаў кіеўскі князь Мсціслаў выслаў полацкіх князёў у Візантыю. Сярод выгнанцаў летапіс называе і бацьку Ефрасінні, разам з якім пакінуць радзіму мусілі таксама яе маці і малодшая сястра Гардзіслава. Як мы ведаем, дынастыя Рагвалодавічаў была ў блізкім сваяцтве з візантыйскімі імператарамі Комнінамі. Такім чынам, высылка мела ў значнай ступені ганаровы характар (полацкія князі атрымалі пасады ў візантыйскім войску і ўдзельнічалі ў войнах з арабамі), і ўсё ж гэта было цяжкае выпрабаванне. Можна толькі здагадвацца, ці дачакалася Ефрасіння ўсіх

сваіх родных назад: пэўнага адказу на гэтае пытанне летапіс не дае.

З «Жыція» вынікае, што Прадслава пайшла ў манастыр у дванаццаць гадоў, але, калі прыняць за прыкладную дату яе нараджэння 1110 год і звязаць пострыг з падзеямі 1129 года, трэба прызнаць, што будучая асветніца была тады ў больш сталым узросце. За гэта гаворыць І сур'ёзнасць прынятага князёўнаю рашэння. Найбольш верагодна, што яна стала манашкаю, маючы 17—19 гадоў. З таго часу пачынаецца перыяд яе асветніцкай працы, на які прыпадае амаль паўстагоддзя.

На схіле жыцця Ефрасіння вырашыла зрабіць паломніцтва ў Ерусалім. Пры яе ўзросце і пры тагачасных шляхах зносін такое падарожжа было сапраўдным подзвігам. Палачане і любімы брат Вячаслаў прасілі князёўну-ігуменню не пакідаць Полацка, але тая ад свайго намеру не адступіла. Як паведамляе «Жыціе», з сабою асветніца ўзяла сваю стрыечную сястру Еўпраксію і брата Давыда. Найбольш верагодна, што паломнікі выправіліся ў дарогу ўзімку і спачатку ехалі па рэках на санях, а потым — водным шляхам. У гэтым нялёгкім падарожжы асветніца мела сустрэчу з візантыйскім імператарам Мануілам Комнінам, які ішоў вайною на венграў. Сваяк прыняў Ефрасінню вельмі прыязна і «съ великою честью посла ю <яе> въ Царьград*», дзе славутую палачанку благаславіў патрыярх. Наведаўшы храм св. Сафіі і набыўшы залатое кадзіла і іншыя неабходныя ў святых мясцінах дарункі, полацкія паломнікі паехалі далей і ўвесну 1173 года дасягнулі Ерусаліма. Захварэўшы ў дарозе, 23 мая таго ж года Ефрасіння памерла і была пахавана ў ерусалімскім манастыры св. Феадосія.

У 1187 годзе, рыхтуючыся да штурму Ерусаліма, султан Саладзін за выкуп дазволіў хрысціянам з іхняй маёмасцю пакінуць горад. Разам з іншымі рэліквіямі праваслаўныя манахі перавезлі раку **

** Царград — усходнеславянская назва Канстанцінопаля, сталіцы Візантыйскай імперыі (з 1453 г. — Стамбул).*

*** Рака (ад лац. arca — скрыня, дамавіна) — своеасаблівы куфар для захоўвання святых мошчаў.*



Ефрасінні з Блізкага Усходу ў Кіеў і перазахавалі яе ў Кіева-Пячорскай лаўры. (Сімвалічная частка мошчаў славутай палачанкі знаходзіцца там і цяпер.) У 1910 годзе астанкі асветніцы даставілі ў Полацк, у заснаваны ёю Спаскі манастыр. Там у 1922 годзе, пры ўдзеле прадстаўнікоў мясцовай улады, духавенства, медыкаў і вучоных адбылося ўскрыццё труны з мошчамі. У заключэнні навукова-медыцынскай экспертызы даецца падрабязнае апісанне астанкаў, якія, на думку экспертаў, муміфікаваліся ў выніку спрыяльных глебавых умоў. * Пасля гэтага мошчы адправілі ў Маскву на выстаўку, а потым — у Віцебскі краязнаўчы музей. На год раней з манастыра былі рэквізаваныя ўсе каштоўнасці і сярод іх срэбная рака вагою 40 пудоў, у якой ляжалі мошчы Ефрасінні. У 1928 годзе манастыр наогул зачынілі.

Пад час акупацыі, калі былі адчынены цэрквы і адноўлены Спаскі манастыр, мошчы Ефрасінні вярнуліся ў Полацк. Рабілася гэта з дазволу і з дапамогаю акупацыйных уладаў (рэліквію суправаджаў прадстаўнік штандарткамендатуры, і ў дзень прыбыцця цягніка з мошчамі ў горадзе адмянілі каменданцкую гадзіну), якія, вядома, клапаціліся не пра беларускую культуру, а мелі свае, далёкія і добра прадуманыя мэты **. Застаецца дадаць, што цяпер астанкі асветніцы захоўваюцца ў Спаскай царкве Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку, які трыццаць пяць гадоў таму назад спыніў сваё існаванне, але, паводле прынятага ў 1988 годзе рашэння, неўзабаве зноў будзе адноўлены.

Вялікі аўтарытэт Ефрасінні імкнулася выкарыстаць у сваіх інтарэсах не толькі праваслаўная царква. У «Хроніцы Быхаўца» ёсць згадка пра дачку полацкага князя Васіля Параскеву, што была абвешчана ў Рыме святою пад імем Праксэды.

** Цалкам пратакол ускрыцця мошчаў Ефрасінні можна прачытаць у фондах Полацкага гістарычна-археалагічнага запаведніка. Гл. таксама: Революция и церковь. 1924. № 1—2. С. 94—95; О святых мощах. М., 1961. С. 81—83.*

*** Тарасаў С. Зруйнаваная памяць муроў // Маладосць. 1989. № 3. С. 126.*

Гэтая князёўна нібыта пастрыглася ў манастыр Спаса над Палатой і там перапісвала сем гадоў кнігі. Потым яна паехала ў Рым, дзе жыла, аддана служачы богу. Там памерла і была пахавана, прычым у яе гонар пабудавалі царкву. В. Данілевіч*, А. Сапуноў** і шэраг іншых аўтараў слушна называюць гэтае летапіснае апавяданне каталіцкай рэдакцыяй жыццяпісу Ефрасінні. Дарэчы, захаваліся звесткі пра крыж з надпісам, што ў рэлікваіі ёсць частка святога дрэва, падараванага Праксэдзе рымскім папам Аляксандрам IV. Гэты крыж быў падробкаю вядомага напрастольнага крыжа Ефрасінні. Цяпер ён знаходзіцца ў Яраслаўска-Растоўскім музеі-запаведніку ***.

** Данилевич В. Е. Очерки истории Полоцкой земли до конца XIV столетия. Киев, 1896. С. 244.*

*** Сапунов А. Католическая легенда о Параскеве, княжне Полоцкой. Витебск, 1888.*

**** Пуцко В. Г. Мнимый крест Параскевы Полоцкой // Беларускія старажытнасці. Мн., 1972. С. 210—219.*

# ПОЛАЦКАЯ КНІЖНІЦА

*Не толькі Біблія * Візантыйскія хронікі і айчынныя летапісы * «Шасцідзёны», «Фізіялог» і «Хрысціянская тапаграфія» * Прырода як храм служэння * Неартадаксальныя трактаты * Ці чытала асветніца Арыстоцеля? * Ефрасіння і аўтар «Слова» * Цяжкая праца перапісчыка * Каму ішлі лісты з Полацка? * Што такое скрыпторый * Агмені асветы * У манастырскай школе * «Юныя учаше чистоте душевней» * Урокі красамоўства * Жорсткасць ці паслядоўнасць?*

## АСНОВЫ СВЕТАПОГЛЯДУ ЕФРАСІННІ

У фармаванні поглядаў Ефрасінні Полацкай, якая стала адной з самых асвечаных жанчын сваей эпохі найперш самаадукацыяй, выключную ролю адыграла тагачасная літаратура.

Прынясце ўсходнеславянскімі землямі хрысціянства вымагала перабудовы ранейшага, язычніцкага светапогляду: уяўленняў пра Сусвет, з'явы прыроды, гісторыю чалавечага роду і г. д. Сярод кніг, якія перакладалі і перапісвалі, прыехаўшы на Русь, візантыйскія і балгарскія святары, а таксама іх мясцовыя паслядоўнікі, большасць складалі, вядома, набажэнскія тэксты і кнігі, дзе выкладаліся асновы хрысціянскага светапогляду і хрысціянскай маралі. Але ў манастыры і ў княжыя харомы траплялa і нямала твораў іншых жанраў: хронік, гістарычных і гістарычна-побытавых аповесцяў, прыродазнаўчых трактатаў. Наогул, жанравая сістэма літаратуры таго перыяду адлюстроўвала светапогляд, тыповы для шмат якіх хрысціянскіх краін ранняга сярэднявечча. «Старажытнарускую літаратуру, — лічыць акадэмік Д. С. Ліхачоў, — можна

разглядаць як літаратуру адной тэмы і аднаго сюжэта. Гэты сюжэт — сусветная гісторыя, і гэтая тэма — сэнс чалавечага жыцця» *.

Апрача біблейных кніг, Ефрасіння яшчэ ў юнацтве не магла не чытаць творы патрыстыкі — рымскіх і візантыйскіх багасловаў, якія лічыліся «айцамі царквы». У полацкіх кнігазборах XII стагоддзя несумненна былі творы выдатнага візантыйскага прапаведніка Іаана Златавуста (344—407), што навучаў вернікаў хрысціянскім дабрачыннасцям, вобразна выкрываў чалавечыя заганы. Пашыранымі былі ў той час таксама творы Грыгорыя Назіянзіна, Васілія Кесарыйскага, Яфрэма Сірына, Іаана Сінайскага і іншых. Патрыстычная літаратура ўмацоўвала асновы хрысціянскай дагматыкі, мела вялікае значэнне ў станаўленні этычных ідэалаў. Тым самым мэтам служылі жыціі святых і пацерыкі — зборнікі кароткіх апавяданняў пра людзей, якія выславіліся сваёй пабожнасцю ці аскетызмам. Са старонак гэтых твораў паўставаў фантастычны, поўны дзівосаў свет, дзе за душы людзей зацята змагаліся сілы дабра і зла. Хвалюючыя праблемы будучыні свету, чалавечага лесу пасля смерці ставілі апокрыфы **, напрыклад, такі папулярны, як «Блуканне Багародзіцы па пакутах».

Кожны адукаваны чалавек XI—XII стагоддзяў павінен быў ведаць псторыю свайго народа. Значыць, Ефрасіння вывучала Нестараву «Аповесць мінулых гадоў», якая ўводзіла ўсходняе славянства ў рэчышча сусветнай гісторыі. Цалкам верагодна, што разам з айчыннымі летапісамі асветніца чытала і папулярныя тады візантыйскія хронікі, што праз дынастычныя сувязі маглі трапляць у Полацк непасрэдна з Візантыі. Адна з такіх кніг, «Хроніка Георгія Амартола», пачыналася ад стварэння свету, затым падавала біблейную гісторыю, гісторыю вавілонскіх і персідскіх цароў, апавядала пра рымскіх і канстанцінопальскіх імператараў. Гэтую кнігу дапаўняла «Хроніка Іаана Малалы». Яе аўтар прызначаў сваю працу шырокаму колу пісьменных людзей, а таму пісаў немудрагеліста і цікава. Чытаючы 18 кніг названай хронікі, можна было, у прыватнасці, пазнаёміцца з антычнымі міфамі і з падзеямі Траянскай вайны, з жыццяпісамі персідскіх цароў, Ромула і Рэма, першых рымскіх валадароў. Не пазней пачатку XII стагоддзя ў землях усходніх славян з'явіўся пераклад «Гісторыі Іудзейскай вайны» Іосіфа Флавія, у цэнтры якой была адна з важных падзей сусветнай гісторыі — паўстанне насельніцтва Іудзеі супраць рымскага ўладарання, захоп і разбурэнне Ерусаліма. Гістарычныя хронікі мелі шматлікія мініяцюры, якія часта адлюстроўвалі рэальных асоб і рэальныя падзеі. У адным з перакладаў кнігі Георгія Амартола быў, напрыклад, малюнак «Вывяржэнне Везувія».

Гістарычныя веды, усведамленне далучанасці сваёй зямлі да агульначалавечага гістарычнага працэсу ўмацоўвалі ў Ефрасінні і яе сучаснікаў ідэі патрыятызму, служэння Бацькаўшчыне.

Уяўленне пра светабудову тагачасным адукаваным людзям давалі творы візантыйскай навуковай думкі. Візантыйскія вучоныя лічылі свет наглядным сведчаннем прамудрасці яго творцы. Паводле іх, прыродныя з'явы, звычкі звяроў і птушак, нават адметнасці мінералаў — усё гэта ўвасобленыя ў жывых істотах і матэрыяльных вобразах нейкія вечныя ісціны або паняцці.

Ефрасіння несумненна чытала так званыя «Шасцідзёны». Гэтыя кнігі дапаўнялі і тлумачылі біблейны расказ пра тое, як за шэсць дзён (адсюль і назва) бог стварыў неба, зямлю, свяцілы, расліны, жывых істот і чалавека. Такім чынам, «Шасцідзёны» былі зводам усіх вядомых на той час візантыйскай навуцы звестак пра жывую і нежывую прыроду. Найбольш пашыраны быў «Шасцідзён» балгарскага экзарха* Іаана. Звесткі з яго—часам яны мелі сапраўды навуковы характар, часам былі

** Лихачев Д. С. Своеобразие древнерусской литературы II Лихачева В. Д., Лихачев Д. С. Художественное наследие Древней Руси и современность. Л., 1971. С. 56.*

*** Легенды аб персанажах біблейнай гісторыі, якія сюжэтна адрозніваюцца ад тых, што змешчаны ў кананічных кнігах Біблii.*

** Экзарх (ад грэч.* **εξαρχοσ** *— кіраўнік, начальнік) — намеснік канстанцінопальскага патрыярха.*

неверагодна фантастычныя — аб'ядноўвала натуральнее для той эпохі захапленне ўсемагутнасцю бога, які здолеў стварыць такі шматстайны, цудоўны і разумна ўладкаваны г.вет.

Прыродазнаўчы характар меў і такі помнік эпохі Ефрасінні, як «Фізіялог». У адрозненне ад «Шасцідзёнаў», што апавядалі аб прыродзе ў цэлым, тут гаворка ішла пераважна пра жывыя стварэнні, у ліку якіх былі і рэальныя і міфічныя: кентаўры, сірэны, неўміручая птушка Фенікс і інш. «Фізіялог» паведамляў пра ўласцівасці нейкай істоты і даваў іх сімвалічнае, найчасцей фантастычнае тлумачэнне, якое павінна было знайсці аналогію паміж гэтымі ўласцівасцямі і адным з багаслоўскіх паняццяў. Як прыклад, можна прывесці аповяд пра льва. Калі верыць «Фізіялогу», ільвіца нараджае нежывое дзіцянё, а потым, праз тры дні, бацька, дыхнуўшы на ільвяня, ажыўляе яго (пэўная аналогія з увасабленнем, смерцю і ўваскрэсеннем Хрыста).

З разважаннямі аб пабудове Сусвету можна было пазнаёміцца, чытаючы «Хрысціянскую тапаграфію» Касмы Індыкаплова, купца, які каля 530 года зрабіў падарожжа па краінах Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі. Індыкаплоў сцвярджае, што Зямля — плоская; яе і неба ён параўноўвае з пакоем, які мае скляпеністую столь. Неба, што бачаць людзі, складаецца з вады, але над ім ёсць яшчэ адно неба — нябачнае. Атмасфернымі з'явамі і рухам свяцілаў кіруюць адмысловыя анёлы.

«Жыціе» і іншыя нешматлікія крыніцы не даюць нам дастатковых звестак, каб з усёй пэўнасцю ахарактарызаваць погляды асветніцы на ўзаемадачыненні чалавека і навакольнага свету, але адну прынцыповую выснову мы, думаецца, маем права зрабіць. Грунтуючыся на біблейным вучэнні, патрыстычная літаратура называла чалавека «мікракосмасам» (малым сусветам), а прыроду — «макракосмасам». Гэта падкрэслівала арганічнае адзінства, у якім павінны існаваць названия сусветы. Ужо ў раннім сярэднявеччы на ўсходнеславянскіх землях была выказана глыбокая думка, што прырода — храм, дзе чалавек здзяйсняе сваё творчае



служэнне. Такі пункт погляду відавочна падзяляла і Ефрасіння Полацкая.

Разам з літаратурай, якая знаходзілася ў рэчышчы артадаксальнай ідэалогіі, да рук асветніцы, бясспрэчна, траплялі і творы, што супярэчылі багаслоўска-схаластычным поглядам на чалавека і прыроду. Візантыйскі вучоны-энцыклапедыст, філосаф, пісьменнік і дзяржаўны дзеяч Міхаіл Псёл (1018—90-я гады XI стагоддзя) у сваіх шматлікіх трактатах, напрыклад, высмейваў веру ў цуды, лічыў, што кожная з'ява прыроднага свету мае натуральную прычыну. Прырода для Псёла — гэта рассеяны паўсюль, нябачны, але спасцігальны розумам пачатак. Этычныя погляды мысліцеля вылучаліся памяркоўнасцю і былі накіраваны супраць празмернага манаскага аскетызму. Сучаснікі абвінавачвалі Псёла ў прыхільнасці да язычніцкай філасофіі, асабліва да Платона. Рацыяналістычныя элементы вучэння Міхаіла Псёла развіваў ягоны паслядоўнік Іаан Італ, які жыў прыкладна за стагоддзе да Ефрасінні. Ён лічыў матэрыю вечнай, адмаўляў пасмяротнае існаванне душы і схіляўся да таго, каб прызнаць або магчымасць яе перасялення, або поўнае знікненне пасля смерці. Італ дайшоў да адкрытага канфлікту з хрысціянствам і царкоўнай ідэалогіяй. Па загадзе імператара Аляксея І Комніна (жанатага з цёткаю Ефрасінні) вучэнне занадта смелага філосафа разгледзеў і аддаў анафеме царкоўны сабор 1082 г.

Ці чытала Ефрасіння працы Арыстоцеля, Платона і іншых антычных філосафаў? Гэтае пытанне застаецца адкрытым, але на яго можна даць і станоўчы адказ, бо сучаснік асветніцы Клімент Смаляціч у сваім «Пасланні Фаме прасвітару» зарэкамендаваў сябе знаўцам антычных твораў.

Гаворачы пра грамадска-палітычныя погляды асветніцы, найперш трэба спаслацца на ленінградскага вучонага Н. С. Сярогіну*. Аналізуючы тэкст знойдзенага ёю спеўнага цыкла пра Ефрасінню,

** Серёгина Н. С. Певческий цикл о Ефросинье Полоцкой — памятник XII века II Конференция «История и археология Полоцка и Полоцкой земли». Полоцк, 1987. С. 52—53.*

даследчыца прыйшла да думкі, што ў ім сцвярджаюцца тыя ж ідэі, што і ў «Слове пра паход Ігаравы»: Палымяны пратэст супраць братазабойчых усобіц, Неабходнасць яднання ўсходнеславянскіх княстваў Перад знешняю пагрозаю. У прысвечаным Ефрасінні Полацкай каноне* гаворыцца: «Князем сродником друг на друга дерзающе подъяти мечь возбранила еси, яко оружие обоюдоостро словесем божим устрашающем». Н. С. Сярогіна лічыць, што невядомы аўтар «Слова» і знакамітая палачанка (яна, несумненна, бывала ў Кіеве) былі людзьмі аднаго кола, мелі блізкія перакананні і светапогляд, а магчыма, і былі знаёмыя. Між іншым, гэтая высновa добра стасуецца з гіпотэзай, паводле якой аўтар «Слова пра паход Ігаравы» быў нашым земляком**.

Як вядома, тагачасныя манастыры былі феадальнымі землеўладальнікамі. Мы не маем прамых ззестак, як ігуменя Ефрасіння ставілася да сялян і іншага залежнага ад манастыра люду. Тут яна, безумоўна, выступала як прадстаўніца свайго класу, але, думаецца, не магла не падзяляць поглядаў Кірылы Тураўскага, які ў адным са «Словаў» выказаў абурэнне з тае прычыны, што валадары «неміласэрныя да рабоў сваіх і да рабынь, не даюць ім досыць ежы і адзення, і работаю насілуюць і іншымі бедамі, і б'юць ні за што». На Ефрасінню мог уплываць і згаданы вышэй Міхаіл Псёл, што ў сваёй «Хранаграфіі» асуджаў любыя спробы выступлення народных нізоў супраць прыгнёту, але крытыкаваў дэспатызм імператара, вялікія выдаткі двара і крывадушнасць манахаў.

Цікавую ўяўляецца праблема стаўлення асветніцы да язычніцкай ідэалогіі, барацьба з якой бы-

** Канон — царкоўнае песнапенне ў гонар святога або свята.*

*** Безсонов П. Белорусские песни. М., 1871. С. XIX; Багдановіч М. Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XIV сталецця // Збор твораў. Мн., 1968. Т. 2. С 104—112; Пичета В. И. Белорусский язык как фактор национально-культурный. Мн., 1924. С. 15; Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўна, 1926. С. 49—50; Мархель У. І. «Слова об палку Ігаравым» у ацэнцы Сыракомлі // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1973. № 6. С. 97—100.*



ла ў той час адной з важных функцый царквы. Царкоўнікі прыцягвалі да судовай адказнасці людзей, абвінавачаных у парушэнні хрысціянскай дагматыкі, нормаў сямейнага права. З гэтымі пытаннямі, пэўна, сустракалася ў сваёй дзейнасці і Ефрасіння Полацкая. Як ужо адзначалася, пазіцыі язычніцтва ў Полацкім княстве і пасля прыняцця хрысціянства заставаліся даволі моцнымі не толькі сярод простага народу, але і ў асяроддзі феадалаў. Язычніцкія вешчуны («волхвы») мелі доступ да княжага двара. Пра гэта сведчыць, напрыклад, летапіснае паведамленне, што князь Усяслаў Брачыславіч Чарадзей нарадзіўся ад «волхвования». Думаецца, невыпадкова гістарычныя крыніцы не падаюць звестак пра якія-небудзь жорсткія ганенні на язычнікаў і іхніх ідэолагаў-вешчуноў у Полацкай зямлі. Хутчэй за ўсё далёкай ад рэлігійнага фанатызму была ў гэтым пытанні і Ефрасіння.

## СХІЛІЎШЫСЯ НАД ПЕРГАМЕНАМ

«Жыціе» апавядае, што, пастрыгшыся ў манастыр, Ефрасіння з дазволу полацкага епіскапа Ільі пасялілася ў Сафійскім саборы ў келлі-галубніцы і «нача книгы писати своими руками».

Працэс пісьма ў той час быў вельмі складаны і марудны. Кнігі пісалі на пергамене ўставам — буйным і прамым, без нахілу, почыркам, у якім кожная літара аддзялялася ад суседняй і, можна лічыць, не пісалася, а малявалася (злітнае пісьмо з'явілася толькі ў XV ст.). Каб тэкст хутчэй высыхаў, яго прысыпалі пяском. Атрамант рабілі з адмысловых арэхаў, з адвару дубовай ці альховай кары, з жалезнай іржы, вішнёвага клею. Каб перапісваць кнігі, мала добра ведаць грамату — неабходна мець і мастацкія здольнасці, бо пачатковыя літары і загалоўкі раздзелаў трэба аздабляць жывёльным ці раслінным арнаментам. Апрача ўсяго іншага, перапісванне кніг было нялёгкаю фізічнаю працай. Крыніцы сведчаць, што тагачасны перапісчык часта пісаў не на стале, а на далоні левай рукі, абапіраючыся локцем аб калена. Гэтай працаю займаліся амаль выключна мужчыны. Ужо адно

тое, што маладая жанчына ўзялася за такую цяжкую справу, было подзвігам.

З «Жыція» можна зразумець, што частка перапісаных Ефрасіняю кніг ішла на продаж, а атрыманыя грошы па яе просьбе раздавалі бедным.

Якія ж кнігі доўгімі гадзінамі дзень пры дні перапісвала ў сафійскай галубніцы Ефрасіння? «Жыціе» не дае адказу на гэтае пытанне, але цалкам верагодна, што, акрамя рэлігійна-маральнай літаратуры, пяро асветніцы выводзіла таксама радкі візантыйскіх гістарычных хронік і айчынных летапісаў, прыродазнаўчых трактатаў і папулярных тады зборнікаў афарызмаў (назвы гэтых кніг мы прыводзілі ў папярэдніх раздзелах). Ефрасіння таксама перакладала літаратуру з грэчаскай, а магчыма, і з лацінскай моваў. Такім чынам, некаторыя кнігі візантыйскіх і іншых замежных аўтараў маглі пашырацца ва ўсходнеславянскіх землях у перакладах славутай палачанкі. Гісторыкі лічаць, што Ефрасіння Полацкая і сама пісала літаратурныя творы, брала ўдзел у стварэнні мясцовага летапісу *, была аўтаркаю, прынамсі, двух манастырскіх статутаў. З «Жыція» вядома, што асветніца мела ліставанне з Візантыяй. Не будзе пярэчыць гістарычнай верагоднасці думка, што яна ліставалася з суайчыннікамі і братамі па духу Кірылам Тураўскім, Кліментам Смаляцічам, з аўтарам «Слова».

Вядома, пры ўсім падзвіжніцтве маладой манахіні прадукцыйнасць яе самотніцкай працы ў келлі была невысокая. Ефрасіння марыла пра тое, каб перапісваннем кніг у Полацку займаліся не адзінкі, а дзесяткі пісьменных людзей. Мара стала яваю пасля заснавання асветніцаю двух манастыроў. «Жыціе» гаворыць пра гэтыя падзеі ў адпаведнасці з канонамі свайго жанру: у сне анёл прыводзіць Ефрасінню ў мясцовасць пад назвай Сяльцо, дзе была драўляная царква Спаса і мураваны храм-пахавальня полацкіх епіскапаў, і загадвае пабудаваць тут манастыр. Напраўду Ефрасінняю, канечне, кіравалі больш натуральныя сілы, а менавіта— імкненне стварыць новыя агмені асветы, якія б спрыялі ажыццяўленню яе ідэй. Атрымаўшы дазвол епіскапа Ільі, яна заснавала на беразе Палаты, за дзве вярсты ад Полацка, жаночы манастыр, а пазней, пры царкве Багародзіцы, і мужчынскі.

** Чамярыцкі В. А. Да пытання'аб раннім летапісанні Беларуса (ХП—ХІП стст.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1965. № 3. С. 90—98.*



У манастырах пад кіраўніцтвам асветніцы дзейнічалі майстэрні па перапісванню кніг — скрыпторыі. Тут існавала спецыялізацыя: адзін рабіў каляровыя ініцыялы і рубрыкі, другі — мініяцюры, трэці — пераплёты. Калі была патрэба перапісаць кнігу хутчэй, яе дзялілі на некалькі частак. Падзел працы значна павялічваў не толькі колькасць кніг, але і іх мастацкі ўзровень. Са скрыпторыяў кнігі разыходзіліся па ўсёй Полацкай зямлі і за яе межы. Іх чыталі вучоныя манахі і прадстаўнікі феадальнай знаці, па іх вучыліся грамаце дзеці.

## «АЗ, БУКІ, ВЕДЗІ...»

Полацкае княства мела вялікую патрэбу ў адукаваных людзях для сферы ідэалогіі і кіравання. Школы, несумненна, існавалі тут і да Ефрасінні, але заснаванне асветніцаю новых манастыроў, яе чынная педагагічная дзейнасць далі развіццю школьнай справы новы штуршок.

Дзеці ў тагачасных школах вучыліся чытанню, пісьму, «цыфіры» і царкоўным спевам. У літаратурных помніках той эпохі часта можна сустрэць пахвалу кніжнаму вучэнню. Яны прыпадабняюць людзей без навукі да бяскрылых птушак: як такая птушка не може падняцца ў неба, так і чалавек не можа дасягнуць без кніг «совершенна разума».

Грамаце вучылі па царкоўных кнігах — Псалтыры, Часаслове, Апостале. Працэс авалодання чытаннем ускладняла тое, што ў рукапісных кнігах не было знакаў прыпынку, словы і сказы часта зліваліся. Спачатку трэба было завучыць на памяць азбуку з няпростымі назвамі літар — «аз», «букі», «ведзі», «глаголь»... Адначасова з гэтым дзеці вучыліся выводзіць літары пісалам на бяросце або на васкаваных дошчачках. Потым вўчылі склады: «ведзі»-«аз»—«ва», «букі»-«он»—«бо» і г. д. Пас-

ля вучань мусіў засвойваць цітлы*. Справіўшыся з гэтай прамудрасцю і навучыўшыся чытаць пасобныя фразы і малітвы, а таксама пісаць, дзеці заканчвалі першы цыкл свайго иавучання. На гэта ішло два — тры гады.

Прыкладна так пачыналі спасцігаць грамату хлопчыкі і дзяўчынкі і ў школах, адчыненых рупнасцю Ефрасінні. Аднак высокаадукаваная ігуменьня, выкарыстоўваючы свае шырокія веды, імкнулася пашырыць межы звычайнай навучальнай праграмы. Апрача царкоўнаславянскай, юныя палачане вучылі грэчаскую, а магчыма, і лацінскую мовы, набывалі звесткі па прыродазнаўстве, рыторыцы, медыцыне. Вялікая ўвага, відаць, надавалася гісторыі. Вучні павінны былі добра ведаць генеалогію дынастыі Рагвалодавічаў, важныя падзеі з жыцця Полацкай зямлі і ўсяго ўсходняга славянства. Напэўна, школа давала веды і па сусветнай гісторыі.

У сваёй педагагічнай дзейнасці Ефрасіння абапіралася на мудрасць народнай дыдактыкі. «Жыціе» паведамляе: «На всяк же день учаше сестры своа: старыя же учаше тръпению и воздръжанию юныя же учаше чистоте душевней и бестрастию телесному, говению образному, ступанию кротку, гласу смирену, слову благочестну, ядению и питию безмолвну, при старейших молчати, мудрейших послушати, къ старейшим покорением, къ точным <роўным> и меншим любовь без лицемерна, мало вещати, а много разумети».

Невядомы нам аўтар «Жыція» быў малодшым сучаснікам асветніцы, магчыма, нават, яе вучнем. Гэта дае падставы выказаць меркаванне, што пададзеныя ў «Жыціі» фрагменты прамоў Ефрасінні маюць рэальную аснову. Вучні і насельнікі манастыроў маглі атрымліваць ад ігуменні выдатныя ўрокі красамоўства. «Се собрах вы, яко кокошь <квактуха> птенца, под крыле свои и въ паствину свою, яко овца,— прамаўляе яна да сясцёр.— Да пасецеся въ заповедех божиих! Да и аз <я> весёлым

* *Надрадковыя знакі ў выглядзе ламанай рыскі, якія ставіліся над скарочанымі словамі або над літарамі, што мелі лічбавае значэнне.*





Ефрасіння, князёўна Полацкая. Гравюра XIX стагоддзя са старажытнага абраза, які знаходзіўся ў Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры



Першая старонка «Жыція Ефрасінні Полацкай» паводле спі-су XVII стагоддзя



Каменны абразок XII стагоддзя з выявамі святых Канстанці-на і Алены, знойдзены ў час археалагічных раскопак у Полацку. (Захоўваецца ў Полацкім краязнаўчым музеі.)

KAMUNIKAT.org



Старонка Полацкага евангелля (XII—XIV стагоддзі) са Свята-Траецкага манастыра. (Захоўваецца ў Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе.)



Абраз Адзігітрыі Полацкай, помнік жывапісу XII стагоддзя (Захоўваецца у фондах Дзяржаўнага Рускага музея ў Ленінградзе.)

KAMUNIKAT.org



Спаскі сабор Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, пабудаваны ў 1152—1161 гадах полацкім дойлідам Іаанам па заказе Ефрасінні. Рэканструкцыя 1976 года



Спаскі сабор Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Гравюра XIX стагоддзя

KAMUNIKAT.org







Крыж Ефрасінні, зроблены ў 1161 годзе Лазарам Богшам

KAMUNIKAT.org



Фрагменты надпісаў на срэбраных бакавых пласцінах крыжа. Здымак канца 20-х гадоў



Фрэска Спаскай царквы. Мяркуюць, што гэтая выява адлюстроўвае вобраз самой Ефрасінні

KAMUNIKAT.org



Фрагмент фрэскавай размалёўкі XII стагоддзя ў Спаскай, царкве





Графіці на сценах Спаскай царквы. XII стагоддзе

KAMUNIKAT.org



Фрэска «Грамніцы» Вялікага храма Бельчыцкага манастыра ў Полацку. XII стагоддзе. Не захавалася



«Барысаў камень», помнік эпіграфікі XII стагоддзя, маўклівы сведка часоў Ефрасінні Полацкай. Восем стагоддзяў ён ляжаў у рэчышчы Дзвіны недалёка ад Полацка. З 1981 года знаходзіцца каля Полацкага Сафійскага сабора.
Гравюра з кнігі А. Сапунова «Двинскне, или Борисовы, камни», выдадзенай у Віцебску ў 1890 годзе.



Рака Ефрасінні Полацкай у Кіева-Пячорскай лаўры. Гравюра з кнігі П. Бацюшкава «Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края», выдадзенай у Пецярбурзе ў 1890 годзе

сердцем подвизаюся учити вас, видящи плоды ваша трудныя и толико дождь проливаю къ вам, а нивы ваша въ едину меру стоят нерастуще, ни поступающе горе. А год приспевает свершению, и лопата на гумне лежить. Но боюся, егда будеть плен <пустазелле> въ вас. Подщитеся, чада моя, убежати таго всего! Но сотворите ся пшеница и осмелитесь въ жерновах смирением...» Уражваюць і багатая вобразнасць гэтага ўрыўка, і яго празрыстасць, цесная сувязь метафар і параўнанняў з жыццём і побытам простата чалавека. Тут, як і ў іншых фрагментах «Жыція», відаць несумненныя літаратурныя здольнасці асветніцы.

Кніжніца Ефрасіння не магла, напэўна, не звярнуць увагі на змешчаны ў «Ізборніку» Святаслава 1073 г. трактат пра паэтыку «Об образех», дзе на канкрэтных прыкладах (у тым ліку з «Іліяды» і «Адысеі») тлумачылася значэнне розных тропаў — алегорый, гіпербал, метафар і г. д. Не выключана, што з вучнямі полацкіх школ, прынамсі, з найбольш здольнымі, праводзіліся заняткі і па паэтыцы.

Школы Ефрасінні Полацкай былі перадавымі для свайго часу і па праграме навучання, і па кантынгенце вучняў, значную частку якіх складалі дзеці простых гараджан.

## СЁСТРЫ-ПАПЛЕЧНІЦЫ

Памочніцамі і апірышчам Ефрасінні ў шматлікіх справах і пачынаннях былі яе сёстры: родная Гардзіслава (у манастве Еўдакія) і стрыечная Звеніслава (у манастве Еўпраксія). «Жыціе» апавядае, што яны трапілі за манастырскія сцены па-рознаму.

Заснаваўшы Спаскі манастыр, маладая ігумення папрасіла бацьку прыслаць да яе сястру ў навучанне грамаце. Той выканаў просьбу дачкі. Далей даведваемся, што Ефрасіння «съ прилежанием учаше о спасении души, а она (Гардзіслава.— *У. А.)* съ прилежанием учашесь и приимаше, яко нива плодовита, умякчивши сердце свое». Затым «Жыціе» паведамляе, што Ефрасіння таемна пастрыгла сваю сястру і здольную вучаніцу ў манашкі,

выклікаўшы гэтым у бацькі вялікі гнеў. «И узьярився на преподобную Ефросинию, сердцем горя. И приеха къ монастырю, глаголя: «Чадо мое милое, что се сотворила еси? Приложи сетование къ сетованию души моей, и печаль къ печали».

З Звеніславаю было іначай. Яна прыйшла да сястры сама і «принесе всю свою утварь златую и порты <уборы> многоценныя»— хутчэй за ўсё ахвяравала храму Спаса свой пасаг. Адносіны Ефрасінні і Еўпраксіі «Жыціе» характарызуе як вельмі блізкія: «яко едина душа въ двою телесу».

Сёстры заставаліся разам усё далейшае жыццё. Звеніславу-Еўпраксію асветніца абрала спадарожніцаю, выпраўляючыся ў канцы свайго зямного шляху ў Ерусалім. Роднай сястры Еўдакіі, пакідаючы Полацк, яна загадала «дръжати и урядити... оба манастыря». Відаць, пасля смерці Ефрасінні Еўдакія заняла месца ігуменні Спаскага манастыра і працягвала асветніцкую дзейнасць старэйшай сястры. Вярнуўшыся з паломніцтва ў святыя мясціны, Еўпраксія была, напэўна, побач з ёю.

Апавядаючы пра ад'езд Ефрасінні ў апошняе падарожжа, аўтар «Жыція» прыводзіць таксама звесткі аб пастрыжэнні ў манастыр яе пляменніц Вольгі і Кірыяны. Як і ў выпадку з Гардзіславай, гэта адбылося супроць волі бацькоў. Даведаўшыся пра намер ігуменні, бацька Вольгі і Кірыяны, яе любімы брат Вячаслаў, спрабаваў пратэставаць і заклікаць да міласэрнасці («Госпоже моя! Что ми хощеши сотворити? Два плача прилагаеши души моей: плача ся отхода твоего и сетуя чаду деля своею»), але ўсё было марна. Іншых звестак пра пляменніц асветніцы не захавалася, аднак, мяркуючы па ўсім, яны як прадстаўніцы княскай дынастыі Рагвалодавічаў павінны былі іграць у манастырскім жыцці не апошнюю ролю.

Прасцей за ўсё ўбачыць у вышэйапісаных паводзінах ігуменні жорсткасць, якая вырасла на глебе рэлігійнага фанатызму. І ўсё ж думаецца, што такія (і сапраўды не надта гуманныя з сучаснага пункту погляду) учынкі дыктаваў Ефрасінні не фанатызм, а найперш — клопат пра будучыню сваёй справы, жаданне мець паплечніц і наступніц.

# ЗБІРАЛЬНІЦА ТАЛЕНТАЎ

*«Приставник над делатели церковными» * Ідэал прыгажосці і гармоніі * Палачане будуюць у Смаленску і Ноўгарадзе * У фондах Рускага музея * Адысея Полацкай Адзігітрыі * Размалёўкі Спаскай царквы * Чыё аблічча на фрэсцы? * Шэдэўр ювелірнага мастацтва * Пра што расказаў старажытны надпіс * Калі не дапамагаюць закляцці * Сляды вядуць за акіян*

## УЗЛЁТ ПОЛАЦКАГА ДОЙЛІДСТВА

Палітычная і эканамічная незалежнасць Полацкага княства спрыяла ўзнікненню тут адметнай школы дойлідства. Яна фарміравалася на аснове візантыйскай архітэктурнай традыцыі, у адпаведнасці з якой быў створаны Сафійскі сабор — першае манументальнае збудаванне на тэрыторыі Беларусь.

Ва ўсходнеславянскіх землях эстэтычныя ідэалы візантыйцаў атрымалі своеасаблівае разумение і развіццё, якое зазнала і заходнееўрапейскі ўплыў. У Полацкім княстве пачынаюцца пошукі новых архітэктурных формаў. Сведчаннем гэтых пошукаў было будаўніцтва прыезджымі майстрамі ў Віцебску царквы Звеставання (Благавешчання), у якой ідэі візантыйскага крыжова-купальнага храма спалучаюцца з некаторымі рысамі архітэктуры Заходняй Еўропы. Адыходам ад ранейшых канонаў вылучаліся царква-пахавальня полацкіх епіскапаў, бажніцы Бельчыцкага (Барысаглебскага) манастыра, што быў заснаваны ў Полацку на мяжы XI—XII стагоддзяў.

У сярэдзіне XII стагоддзя канчаткова скла-

лася Полацкая школа дойлідства. Для яе была характэрная муроўка з плінфы* з так званым схаваным радам — адны рады цэглы выступалі, другія былі як бы прыхаваныя ўглыб, а прамежак паміж імі запаўняўся цамянкай**. Знадворку будынкі не атынкоўвалі, і такая тэхніка муроўкі ўтварала двухколерную «паласатую» гаму сцяны. Полацкія майстры адыходзяць ад візантыйскіх крыжова-купальных храмаў з некалькімі апсідамі*** і набліжаюцца да стварэння выключна новых формаў.

Найвышэйшы ўзлёт полацкай архітэктурнай школы, звязаны з творчасцю дойліда Іаана, прыпадае на гады асветніцкай дзейнасці Ефрасінні. Гэтае супадзенне, вядома, не выпадковае.

Іаан быў манахам аднаго з мясцовых манастыроў. Гэты надзелены самабытным талентам майстар пакінуў у Полацку не меней як тры храмы****. Ефрасіння ўважліва сачыла за ягонай творчасцю. Задумаўшы ў сярэдзіне XII стагоддзя будаваць сабор для свайго манастыра, яна, натуральна, звярнулася да Іаана, на рахунку якога ўжо былі такія адметныя спаруды, як цэрквы Параскевы-Пятніцы і Барыса і Глеба ў Бельчыцах. «Бе муж Иоан, приставник над делатели церковными *****,— апавядае «Жыціе». — Къ нему же многажды прихожаше, глаголила: «Иоане, востани пойди на дело вседрържителю Спасу!» И въ един от дний востав, Иоан прииде къ блаженой Ефросинии и рече: «Ты ли, госпоже, присылаеши и понужаеши мя на дело?» Она же рече: «Ни». И пакы размысливши

* *Плінфа — тонкая (4—5 см таўшчынёю), добра абпаленая цэгла.*

** *Цамянка — вапнавы раствор з тоўчанай цэглай, што надавала яму ружовае адценне.*

*** *Апсіда — паўкруглая або шматвугольная частка храма, якая выступае за контуры ягонага плана і ў якой размяшчаецца алтар.*

**** *Гл. Воронин Н. Н. У истоков русского национального зодчества // Ежегодник института истории искусств. М., 1952; Воронин Н. Н. К истории полоцкого зодчества XII века Ц Краткие сообщения Института археологии Академии наук СССР. 1962. № 7.*

***** *Кіраўнік арцелі майстроў-муляраў.*



премудрая жена и рече ему: «Аще не аз тя возбуждаю, а кто тя взывает на таково дело, того послуша, и прилежно съ тщанием».

«И потом блаженая Ефросиниа заложи церковь камену святого Спаса. От начатка и устроена за 30 недель»,— паведамляе аўтар «Жыція». У яго апавяданні пра будаўніцтва храма прысутнічае абавязковае для такіх твораў дзіва: у канцы працы ў муляраў скончылася цэгла і не было чым «верха окончати», але назаўтра пасля малітваў ігуменні Ефрасінні майстры знайшлі «плиты въ пещи». Аднак сапраўднае дзіва здзейснілі не малітвы, а магутны талент Іаана. Вядомы гісторык Л. В. Аляксееў называв будаўніцтва Спаскага сабора «найбуйнейшаю падзеяй у полацкай і ва ўсёй старажытнарускай архітэктуры»*. Ефрасіння, безумоўна, была не толькі фундатаркаю храма, але і дарадчыцай, памочніцай, натхняльніцай таленавітага майстра.

Змураваная за адзін будаўнічы сезон Спаская, або Спаса-Праабражэнская (цяпер яе часта і не зусім правільна называюць Спаса-Ефрасіннеўскай), царква — вяршыня архітэктурнай думкі Полацка. Гэты трохнефавы**, шасцістаўповы крыжова-купальны храм манастырскага тыпу памерам 8x12 метраў. Цэнтральны шырокі неф з усходу завяршае масіўная паўкруглая апсіда, а бакавыя нефы — паўкруглыя нішы, схаваныя ў тоўшчы сцяны. Паўднёвы і паўночны фасады расчляняюцца пілястрамі з паўкалонамі. Яны рытмічна дзеляць паверхню на два вузкія і два шырокія прасценкі з размешчанымі на двух узроўнях паўцыркульнымі вокнамі (ніжнія ў 1,5 раза большыя за верхнія). Царква мела пазакамарнае*** пакрыццё асноўнага аб'ёму і больш нізкага бабінца (прытвору). Цяпер старажытным закамарам адпавядаюць толькі тры ўсходнія паўкружжы паўночнай і паўднёвай сцен.

* *Алексеев Л. В. Полоцкая земля. М., 1966. С. 212.*

** *Неф — падоўжаная частка храма, абмежаваная з абодвух ці з аднаго боку шэрагам калон або слупоў.*

*** *Закамара — паўкруглае ці кілепадобнае завяршэнне часткі сцяны будынка, якое адпавядае форме ўнутранага скляпення.*

Барабан купала ўзвышаўся над скляпеннямі і абапіраўся на кубічны пастамент. Важнаю рысаю Спаскага сабора было тое, што тут упершыню на тэрыторыі Беларусі з'явіліся (на гранях пастамента і над ягонымі вугламі) какошнікі *. Закамары і какошнікі мелі кілепадобнае завяршэнне, што яшчэ больш падкрэслівала стройнасць храма. Будынак завяршаў барабан з выцягнутымі вокнамі і шаломападобным купалам. У сярэдзіне храма асаблівасці кампазіцыі нараджалі ілюзію велізарнай вышыні. У заходняй сцяне, у два разы таўсцейшай за паўночную і паўднёвую, ішоў ход на хоры, паабапал якіх былі келлі Ефрасінні (з паўднёвага боку) і Еўдакіі (з паўночнага). Тут прайшла значная частка жыцця асветніцы і яе сястры.

Іаан паставіў перад сабой задачу стварыць кампазіцыю, якая імкнецца ўгору, і бліскуча справіўся з ёю. Размешчаная на беразе Палаты і цудоўна ўштукаваная ў ландшафт, Спаская царква і цяпер, пасля праведзенай у XIX стагоддзі частковай перабудовы, выклікае надзвычай моцнае ўражанне завершанасці і суладнасці.

Для Ефрасінні і яе сучаснікаў кожны храм быў вобразам і мадэллю Сусвету. У храмах увасабляліся ідэалы прыгажосці і гармоніі. Думаецца, што пачуцці і адчуванні асветніцы, калі яна ўпершыню ўбачыла новы сабор без рыштаванняў, былі падобныя да пачуццяў Міхаіла Псёла, які ў сваёй «Хранаграфіі» пісаў пра храмы: «Вока нельга адвесці не толькі ад невыказнай прыгажосці цэлага, з цудоўных частак сплеценага, але і ад кожнай часткі паасобку, і хоць ад іх можна атрымліваць асалоду бясконца, ніводнаю не ўдаецца палюбавацца дасхочу, бо позірк да сябе прыцягвае кожная...»

Вядомы беларускі гісторык Г. В. Штыхаў і шэраг іншых даследчыкаў лічаць, што Спаскі сабор быў збудаваны паміж 1152 і 1159 гадамі **.

Заканчэнне будаўніцтва некалькі дзён святкаваў увесь горад. Аўтар «Жыція» паведамляе: «Преподобная же Еуфросиния, видевши церковь совръшенную, возрадовася душею. И бысть священие и велиа радость всем крестьяном. И собрашась князи и силнии мужи, черноризици и черноризци, и простие людие. И бысть радость велиа. И праздновавша дни мнози». Р асвячэннем новага храма можна звязаць адну з прамоў Ефрасінні, фрагменты якой захавала «Жыціе».

** Какошнік — несапраўдная закамара, што мае дэкаратыўнае значэнне.*

*** Штыхов Г. В. Древний Полоцк. Мн., 1975. С. 124.*



Падтрыманыя асветніцай наватарскія ідэі Іаана пачалі хутка пашырацца не толькі на радзіме, у Полацкай зямлі, але і ў суседніх княствах. Гэтаму спрыяла праца полацкіх майстроў у іншых усходнеславянскіх землях. У канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў XII стагоддзя хтосьці з полацкіх дойлідаў узвёў у Смаленску княскі палацавы сабор архангела Міхаіла і гэтым заклаў асновы смаленскай архітэктурнай школы. Прыкладна ў той самы час палачане пабудавалі на Сінічай гары ў Ноўгарадзе царкву Пятра і Паўла*. У Наваградку полацкія дойліды ў 2-й палове XII стагоддзя збудавалі з плінфы галерэю трохапсіднага храма, які знаходзіўся на месцы сучаснай Барысаглебскай царквы.

## СТАРАЖЫТНЫЯ ВОБРАЗЫ

У фондах Рускага музея ў Ленінградзе захоўваецца старажытны абраз Боскай маці, вядомы пад назваю Адзігітрыя Полацкая. Гэта жывапісны твор XII стагоддзя мае вельмі цікавую гісторыю. Яна пачынаецца з рашэння Ефрасінні ўпрыгожыць сабор, што быў пабудаваны ў заснаваным ёю Багародзіцкім мужчынскім манастыры. З «Жыція» мы даведваемся, што знакамітая палачанка паслала слугу Міхаіла ў Царград да візантыйскага імператара Мануіла Комніна і патрыярха Лукі Хрысаверга. Пасланец вёз багатыя дарункі і просьбу Ефрасінні прыслаць ёй абраз Багародзіцы Эфескай, адзін з трох абразоў, што, паводле хрысціянскага падання, яшчэ пры жыцці дзевы Марыі напісаў з яе першы іканапісец апостал Лука, які з гэтае прычыны ў сярэднявеччы лічыўся апекуном мастакоў. Імператар Мануіл паставіўся да просьбы

** Полоцк. Исторический очерк. Мн., 1987. С. 39.*

полацкай сваячкі з разумением. Адпраўленыя ім у Эфес сто воінаў прынеслі абраз у Канстанцінопаль, адкуль пасля блаславення патрыярхам у храме святой Сафіі рэліквія была паслана Ефрасінні. «Она же,— чытаем у «Жыцці,— внесше въ церковь святей богородици и постави ю ... и украси ю златом и камением многоценным». У 1239 годзе Эфескі (Корсуньскі) абраз перанеслі з Полацка ў горад Тарапец і перадалі ў мясцовую Уваскрасенскую царкву. Прычынаю такога шчодрага ахвяравання было вянчанне ў гэтай царкве дачкі полацкага князя Брачыслава князёўны Параскевы з роду Рагвалодавічаў і князя Аляксандра Яраславіча, пазней названага Неўскім. Адтуль ужо ў XX стагоддзі рэліквія «пераехала» ў ленінградскі музей.

На думку многіх даследчыкаў, гэты абраз з'яўляецца самым раннім узорам іканаграфічнага тыпу Адзігітрыі (у перакладзе з грэчаскай — Пуцяводнай) на ўсходнеславянскіх землях. Такія помнікі маюць надзвычай вялікае значэнне, бо менавіта з іх пачынаецца мастацкая традыцыя. Відаць, невыпадкова выявы Адзігітрыі — адзін з самых улюбёных сюжэтаў у беларускім іканапісу.

Абраз уражвае прамой ганарыстай паставай, бездакорнымі прапорцыямі. На плечы багародзіцы ўрачыста падае мафорый* з па-майстэрску намаляванымі складкамі.

Сапраўдная Полацкая Адзігітрыя сёння схаваная пад больш познімі фарбамі, аднак уяўленне пра пачатковую выяву дае фотаздымак, зроблены электронна-аптычнымі прыборамі ў інфрачырвоным святле. Даследчык старажытнага абраза мастацтвазнаўца В. Ф. Шматаў** піша пра яго чыстыя і звонкія фарбы, спакойнае высакародства і чысціню вобраза святой, пра спагадлівы ветлы выраз крыху наіўнага прыгожага твару, пра пяшчоту ў шырока расплюшчаных вачах.

На аўтарства Адзігітрыі «прэтэндуе» святы Лука, але яна відавочна мела і рэальнага аўтара.

*Від жаночага галоўнога убору.*

*** Шматаў В. Загадка полацкай Адзігітрыі // Беларусь 1987. №8. С. 19.*



В. Ф. Шматаў нават дапускае, што абраз з фондаў Рускага музея мог быць створаны не ў Візантыі, а ў самім Полацку паводле прысланага імператарам Мануілам грэчаскага ўзору, які да нашых дзён не захаваўся. Пэўныя падставы для гэтай гіпотэзы дае стылёвае падабенства Полацкай Маці боскай з манументальным жывапісам Спаскай царквы.

Як вядома, заказчыцай фрэсак у пабудаванай Іаанам бажніцы была Ефрасіння. Тут яна зноў выступав як збіральніца і апякунка талентаў.

Спаская царква — адзіны храм у Беларусі, дзе фрэскавыя размалёўкі XII стагоддзя захаваліся амаль цалкам. Размешчаныя ярусамі фрэскі ўпрыгожвалі сцены, слупы і купал. Шматфігурныя кампазіцыі чаргаваліся з аднафігурнымі. Старажытныя выявы і цяпер хвалююць сваёй адухоўленасцю, стрыманай, але багатаю гамай, у якой спалучаюцца карычневыя, чырвоныя, жоўтыя, сінія, смарагдава-зялёныя колеры і адценні.

Пакуль што размалёўкі раскрыты толькі фрагментарна і асноўная іх частка захоўваецца пад алейнымі фарбамі XIX стагоддзя, якія апошнім часам з прычыны неспрыяльнага тэмпературна-вільгацевага рэжыму ў храме сталі інтэнсіўна ападаць. Упершыню работа па расчыстцы полацкіх фрэсак пачалася ў 1929 годзе экспедыцыяй Цэнтральнай дзяржаўнай рэстаўрацыйнай майстэрні (Масква), у склад якой уваходзіў вядомы жывапісец і мастацтвазнаўца І. Э. Грабар. Затым размалёўкі Спаскай царквы вабілі да сябе шматлікіх даследчыкаў. У 80-я гады фрэскі вывучала экспедыцыя сектара старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

Ці не самым цікавым адкрыццём апошняга часу сталі фрагменты размалёўкі келлі самой Ефрасінні. Прастору сцен яе малельні займалі кампазіцыі сяміфігурнага «Дэісуса», «Звеставання», «Укрыжавання», «Грамніц» і іншыя. Характэрныя рысы гэтых фрэсак — іхняя камернасць і маляўнічасць. Тут захавалася выява дзевы Марыі, тонкія дасканалыя лініі твару якой нагадваюць найлепшыя грэчаскія ўзоры.

Аналізуючы фрэскі Спаскай царквы, даследчыкі адзначаюць іх псіхалагічную глыбіню, эмацыянальнасць, духоўную актыўнасць вобразаў. Полацкія майстры былі добра знаёмыя з класічнай візантыйскай манерай жывапісу XI—XII стагоддзяў, а таксама з прыёмамі раманскага мастацтва*. Некалькі манераў пісьма (абліччы з буйнымі рысамі, суровым змрочным выразам, з павялічанымі вачыма на адных фрэсках і амаль партрэтныя выявы на другіх) дазваляюць выказаць здагадку, што тут працаваў не адзін жывапісец**.

Найбольш індывідуалізаваныя ў размалёўках Спаса жаночыя вобразы. Мастацтвазнаўцы лічаць, што на такі жыццёва верагодны паказ не адважваліся ні кіеўскія, ні наўгародскія мастакі***. Самае моцнае ўражанне пакідае выява святой на паўночна-заходнім гранёным слупе, які падтрымлівае хоры. Твар з дугападобнымі бровамі і асабліва вочы намаляваныя настолькі пранікнёна, з такой жыццёвай пераканаўчасцю, што міжволі ўзнікае думка: перад намі не святая, а рэальная зямная жанчына. Дапытлівы і цвёрды позірк яе глыбокіх вачэй кажа пра багатае і напружанае духоўнае жыццё, выклікае на роздум пра годнасць чалавека, пра сэнс яго існавання. Няма нічога дзіўнага ў тым, што некаторыя даследчыкі называюць гэты фрагмент партрэтам самой Ефрасінні Полацкай. Вядома, катэгарычна сцвярджаць гэта нельга, але несумненна, што на мастака не магла не ўплываць фізічная і духоўная прыгажосць асветніцы і яе сясцёр.

## КРЫЖ ЛАЗАРА БОГШЫ

З імем асветніцы непасрэдна звязана і стварэнне полацкім майстрам Лазарам Богшам

** Монгайт А. Л. Фрески Спасо-Евфросиньевского монастыря в Полоцке II Культура Древней Руси. М., 1966. С. 137—140.*

*** Больш падрабязна пра фрэскі Спаскай царквы ў Полацку гл.: Псторыя беларускага мастацтва. Т. 1. Мн., 1987. С. 77—84; Церашчатава В. В. Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст. Мн., 1986. С. 25—48.*

**** Сяліцкі А. А. Старажытныя фрэскі Ц Помнікі гісторыі I культуры Беларусь. 1978. № 3. С. 38.*



славутага крыжа — шэдэўра старажытнабеларускага ювелірнага мастацтва. Богша зрабіў яго па заказе Ефрасінні для Спаскага манастыра ў 1161 годзе. Крыж выконваў ролю каўчэга для захавання атрыманых ігуменняй з Канстанцінопаля і Ерусаліма хрысціянскіх «святынь»: кроплі крыві Ісуса Хрыста, часткі крыжа гасподняга, каменя ад труны Багародзіцы, часткі мошчаў святых Панцеляймона і Стэфана і г. д.

Аснова шасціканцовага крыжа (яго даўжыня каля 52 см) драўляная. Зверху і знізу дрэва закрываюць залатыя пласткі, аздобленыя каляровымі перагародкавымі эмалямі з выявамі святых, каштоўнымі камянямі і арнаментальнымі кампазіцыямі. Лазар Богша быў выдатна знаёмы не толькі з адпаведнай тэхнікай, але і з асаблівасцямі эмальернага мастацтва. Эмалі полацкага майстра не саступаюць найлепшым узорам візантыйскага прыкладнога мастацтва, якія мелі сусветную славу*. На верхніх канцах крыжа ён размясціў паясныя выявы Хрыста, Багародзіцы і Іаана Папярэдніка. У цэнтры ніжняга перакрыжавання — чацвёра евангелістаў, на канцах — архангелы Гаўрыіл і Міхаіл. Унізе адлюстраваны патроны (апекуны) заказчыцы і яе бацькоў — святыя Ефрасіння, Сафія і Георгій. На зваротным баку рэліквіі знаходзяцца выявы айцоў царквы — Іаана Златавуста, Васіля Вялікага, Грыгорыя Багаслова, а таксама Пятра, Паўла, Дзмітрыя, Стэфана і Панцеляймона. Таксама ўнізе — дробны надпіс: «Господи, помози рабоу своемоу Лазорю, нареченомоу Богъши, съделавъшемоу крьстъ сии црькви святаго Спаса и Офросиньи». Твор полацкага ювеліра дазваляе казаць пра высокі эстэтычны густ як майстра, так і самой асветніцы.

Крыж Ефрасінні Полацкай адначасова з'яўляецца каштоўным помнікам старажытнабеларускага пісьменства. Апрача згаданага вышэй кароткага надпісу, што паведамляе імя майстра, на срэбных з пазалотаю пластках, якімі абкладзены бакі рэліквіі, выбіты вялікі тэкст з шэрагам цікавых гістарычных звестак. Гэты надпіс варты таго, каб

** Штыхов Г. В. Древний Полоцк. Мн., 1975. С. 111.*

прывесці яго цалкам: «Въ лето 6669 покладаеть Офросинья чьстьный кресть въ манастыри своемъ въ црькви святого Спаса. Чьстьное древо бесценьно есть, а кованье его злото и серебро и каменье и жьнчюгъ въ 100 гривнъ а да... <пропуск—*У. А.*> 40 гривнъ. Да не изнесеться из манастыря никогда же, яко ни продати ни отдати. Аще се кто преслоушаеть изнесеть и от манастыря, да не боуди емоу помощникъ чьстьный крестъ ни въ се(й) векъ ни въ боудоущий и да боудеть проклятъ святою животворящею троицею и святыми отци 300 и 50 (?) семию съборъ святыхъ отець, и боуди емоу часть съ Июдою, иже преда Христа. Кто же дрьзнеть сътворити се... властелинъ или князь или пискоупъ или игоуменья или инъ который либо человекъ а боуди емоу клятва си. Офросинья же, раба Христова, сътяжавъши крестъ сий, прииметь вечную жизнь съ всеми святыми...»*

У першай частцы тэксту паведамляецца кошт дарагіх металаў і камянёў, якія пайшлі на аздабленне крыжа. 40 грыўняў — мабыць, плата, якую атрымаў сам Лазар Богша. Гэта былі вялікія грошы: прыкладна столькі ж плацілі за работы па машчэнню 8000 локцяў** драўлянай маставой*** або за 160 лісіных шкур. Адсюль можна зрабіць выснову, што Лазар Богша — заможны рамеснік-ювелір, асабіста свабодны чалавек. Даследчыкі лічаць, што свецкае імя Богша, магчыма,— скарочаная форма ад Багуслаў. Наяўнасць двух імёнаў была ў той час традыцыяй: бацька Ефрасінні Георгій меў, напрыклад, яшчэ адно імя— Святаслаў.

Другая палова вялікага надпісу на крыжы — тыповае для той эпохі закляцце. Ягоную ўскладнёнасць (спасылкі на трыста святых айцоў, на ўсяленскія саборы) можна, відаць, растлумачыць вялізным коштам рэліквіі.

* *Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. Мн., 1961. С. 11—12.*

** *Локаць — старажытная мера даўжыні, прыблізна роўная 0,5 метра.*

*** *Алексеев Л. В. Полоцкая земля. М., 1966.* С. 226.



Цікава, што першая, дзелавая, частка захаванага на крыжы тэксту напісана на старажытнаўсходнеславянскай мове, а ў другой аўтар (верагодна, сама Ефрасіння) звяртаецца да царкоўнаславянскай і выкарыстоўвае ўласцівыя для рэлігійнай літаратуры вобразы. Надпіс мае мясцовыя лексічныя асаблівасці, да якіх можна аднесці словы «пискоупъ» (епископ), «древо», «злото».

Змешчанае на крыжы закляцце, што абяцала страшную кару таму, хто ўкрадзе або аддасць ці прадасць святыню, безумоўна, дзейнічала на сучаснікаў Ефрасінні і на іхніх нашчадкаў. І ўсё ж страх перад божым пракляццем не быў усемагутны. Пасля смерці асветніцы крыж Лазара Богшы знаходзіўся ў Спаскім манастыры нядоўга. Ужо на мяжы XII—XIII стагоддзяў яго вывезлі з Полацка смаленскія князі. Крыж захоўваўся ў іх да пачатку XVI стагоддзя, пакуль вялікі князь Васіль III пасля захопу Смаленска (1514) не забраў рэліквію ў Маскву. Пад 1563 годам Ніканаўскі летапіс паведамляе: «Когда же боголюбезный царь и великий князь (Іван Грозны.— *У. А.)* мысля итти на отступников крестьянския веры на безбожную Литву, бе же тогда в его царской казне крест Полоцкий украшен златом и камением другим, написано же на кресте: «зделан сий крест в Полотцку повелением княжны Евфросинии и поставлен во церкви всемилостиваго Спаса, да не изнесит ис тое церкви никтоже; егда же кто его из церкви изнесет, да приимет с тем суд в день судный. Нацыи же поведают: в прежний некогда Смолняне и Полочане держаше у себя государей князей по своим волям и межь себя смолняне съ полочаны воевахуся и тот крест честный Смолняне въ Полотцку взяша в войне и привезоша въ Смоленеск, егда же благочестивый государь князь великий Василей Иванович всеа Русии вотчину свою Смоленеск взял, тогда же и тот честный крест взя с собою и имея надежу на милосердаго Бога и на крестьную силу победити врага своя, еже и бысть».

Падчас аблогі Полацка ў 1563 годзе Іван Грозны спыняўся паблізу Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Напэўна, тады пабожны цар, просячы ў неба

перамогі, і загадаў вярнуць полацкую святыню на яе ранейшае месца. Магчыма, ён зрабіў гэта і крыху пазней — калі замольваў грахі пасля ўчыненых па ягоным загадзе ў Полацку крывавых злачынстваў*.

У 1579 годзе, калі горад узялі войскі караля Рэчы Паспалітай і вялікага князя Літоўскага Стэфана Баторыя, крыж Ефрасінні быў у Спаскай царкве. Далейшы лёс бясцэннага твора Лазара Богшы поўны прыгод і загадан, на аснове якіх можна было б напісаць захапляльную дэтэктыўную аповесць. Калі царква Спаса перайшла да ордэна езуітаў, крыж Ефрасінні палачане захоўвалі ў Сафійскім саборы, які з канца XVI стагоддзя да 1839 года быў уніяцкім** храмам. Добра разумеючы ўплыў рэл396 на вернікаў-беларусаў, езуіты распачалі судовы працэс, каб вярнуць крыж у Опасную царкву і выкарыстоўваць яго ў сваіх мэтах. Галоўным іх аргументам быў старажытны надпіс. ёсць звесткі***, што, прайграўшы працэс, новыя гаспадары Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра паспрабавалі атрымаць крыж хітрасцю. Аднойчы, калі на свята Узвіжання рэліквію вынеслі на сярэдзіну храма, агент езуітаў падмяніў яе, паклаўшы на аналой падрыхтаваную загадзя падробку. Уніяты заўважылі падлог, і выкрадальніка вельмі хутка затрымалі.

У 1812 годзе Полацк на некалькі месяцаў трапіў у рукі французаў. У гэты час крыж замуравалі ў сцяне Сафійскага сабора. Пасля скасавання уніі і аднаўлення праваслаўнага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра (1841) ён захоўваўся ў келлі Ефрасінні. У 1921 годзе ў ліку іншых манастырскіх каштоўнасцяў крыж быў рэквізаваны і сляды яго на нейкі час згубіліся. У 1928 годзе дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея Вацлаў Ластоўскі, каб адшукаць рэліквію, накіраваў у Полацк адмысловую экспедыцыю. Крыж быў знойдзены ў мясцовым фінаддзеле і перададзены ў Беларускі дзяржаўны музей у Мінску*. Перад самай Вялікай Айчыннай вайной унікальны твор Лазара Богшы знаходзіўся ў Магілёве, у будынку былога зямельнага банка, адкуль, паводле афіцыйнай версіі, у 1941 годзе яго выкралі фашысцкія захопнікі. Далейшы лес крыжа невядомы. Апошнім часам у друку з'явіліся паведамленні, што, па некаторых звестках, шэдэўр старажытнабеларускага мастацтва знаходзіцца ў прыватнай калекцыі аднаго з амерыканскіх мільярдэраў. Будзем спадзявацца, што прыйдзе пара, калі крыж Ефрасінні Полацкай — наша нацыянальная святыня — вернецца на Радзіму і стане ўласнасцю народа, якому ён павінен належыць.

* *Пасля захопу Полацка войскам Івана Грознага там было знішчана ўсё іншавернае насельніцтва. 11060 сялян, якія схаваліся ў Ніжнім замку, цар раздаў падначаленым. 50000 мяшчан і шляхты таксама былі ўзятыя ў палон. Тыя, хто адмовіўся ад царскай службы, разам з жонкамі і дзецьмі доўга сядзелі па турмах у кайданах, а проз сем гадоў 665 палонных па царскім загадзе былі забітыя.*

** *Царкоўная унія — аб'яднанне праваслаўнай і каталіцкай цэркваў на ўмовах прызнання вяршэнства папы рымскага з захаваннем сваіх абрадаў і набажэнства на роднай мове. На Беларусі была ўведзена ў 1596 годзе. Па падліках вядомага гісторыка А. П. Грыцкевіча, у канцы XVIII стагоддзя уніяты на беларускіх землях складалі 75% насельніцтва,*

*** *Поселянин Е. Преподобная Евфросинія, княжна Полотская. СПб, 1910. С. 25—26.*

* *Савецкая краіна. 1931. № 3. С. 28—29.*

# У ГУШЧЫНІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

*Пра што маўчыць «Жыціе» * Сцяг незалежнасці * Крывавы вір усобіц * Всех хотяше имети, яко едину душю * З думай пра будучыню Радзімы*

Складзенае паводле царкоўных канонаў «Жыціе Ефрасінні Полацкай» маўчыць пра палітычныя падзеі, якія ў той час адбываліся на зямлі нашых продкаў. Для нас жа несумненна, што асветніца была не сузіральніцаю гэтых няпростых і драматычных падзей, а іх чыннай удзельніцаю, што яна амаль паўстагоддзя значна ўплывала на палітыку Полацка.

На незалежнай Полацкай зямлі ў XII стагоддзі адбываўся заканамерны працэс феадальнага драблення на паасобныя ўдзелы: Менскі, Друцкі, Ізяслаўскі, Віцебскі, Лагойскі. Тут сядзелі сыны Усяслава і іхнія нашчадкі, якія вялі паміж сабою зацятую барацьбу за полацкі стол. Найбольш прыкметнаю асобаю сярод іх быў менскі князь Глеб Усяславіч, што працяглы час даволі паспяхова ваяваў з Уладзімірам Манамахам, але ўсё ж быў перамоканы і ў 1119 годзе памёр (відаць, не сваёй смерцю) у Кіеве.

У юнацтве Ефрасіння была сведкаю вялікага паходу на Полацкую зямлю, арганізаванага наступнікам Манамаха вялікім кіеўскім князем Мсціславам. Тады, у 1127 годзе, аб'яднаныя сілы васьмі князёў да Полацка не дайшлі, але палачане вымушаны былі прагнаць свайго князя Давыда з сынамі і прыняць, напэўна, больш дагоднага Кіеву Барыса Усяславіча Друцкага. Праз два гады пасля гэтага Рагвалодавічы адмаўляюцца ісці на полаўцаў, і Мсціслаў высылае непакорлівых князёў у



Візантыю, што хутчэй за ўсё і стала знешняю прычынаю пострыгу князёўны Прадславы.

Падчас высылкі Рагвалодавічаў яна засталася, магчыма, адзінаю прадстаўніцай полацкай дынастыі на радзіме. Кіеўскія стаўленнікі рабавалі краіну, падрываючы эканамічную базу Полацкай зямлі, хадзілі паходамі на яе даннікаў, распраўляліся з прыхільнікамі адпраўленых у Візантыю мясцовых князёў. У такіх умовах, укрыўшыся за манастырскімі сценамі, Ефрасіння была своеасаблівым сцягам змагання палачан за незалежнасць. Цяжка меркаваць, ці брала Ефрасіння непасрэдны ўдзел ў вечавых сходах, але яе ўздзеянне на веча, безумоўна, было вельмі значнае. Праз яго князёўна-ігумення ўплывала не толькі на запрашэнне ў Полацк князёў, але і на прызначэнне епіскапаў, бо веча павінна было ўхваліць прапанаваную кіеўскім мітрапалітам кандыдатуру. Думаецца, менавіта са згоды Ефрасінні, а можа, і па яе наказе ў 1132 годзе жыхары Полацка выгналі прысланага з Кіева Святаполка Мсціславіча і абвясцілі сваім князем Васільку Святаславіча з мясцовай дынастыі, які таемна вярнуўся з Візантыі або нейкім чынам здолеў пазбегнуць высылкі. «Полочане же рекше: «лишается нас» и выгнаша Святополка, а Василка посадиша Святославича»,— паведамляе пра гэтыя падзеі летапіс.

Ефрасіння, надзеленая не толькі ясным розумам, але і моцнай воляю, рашучасцю, што часам межавала з неміласэрнасцю (згадайма, напрыклад, пастрыжэнні ў манастыр яе пляменніц), мела вялікую вагу ў вырашэнні палітычных пытанняў і ў далейшым. Яна не магла стаяць у баку ад падзей 1151 года, калі полацкае веча прагнала князя Рагвалода-Васіля і запрасіла з Менска Расціслава Глебавіча. Праз восем гадоў палачане зноў прынялі да сябе Рагвалода, што пачаў барацьбу з менскімі Глебавічамі. Пра драматычныя падзеі 1159 года падрабязна апавядае Кіеўскі летапіс. Мы даведваемся, што ў Полацку «бысть мятеж велик ... мнози бо хотяху Рогволода». У горадзе ўзнікла змова супраць Расціслава. «Князе нашь,— пісалі палачане да Рагвалода,— согрешили есмь к Богу и к тебе,

оже вестахом на тя без вины и жизнь твою всю разграбихом и твоея дружины, а самого емше выдахом тя Глебовичем на великую муку. Да еще ныне помянеши всего того, иже сотворихом своим безумием, и хрест к нам целуеши, то мы людие твое, а ты еси нашь князь, а Ростислава ти емше вдамы в руче*, а еже хощеши, то створиши ему...» Замах на Расціслава прызначылі на дзень святога Пятра, калі князя можна было выклікаць на братчыну ля царквы (старой) Багародзіцы. Аднак князя хтосьці папярэдзіў і той прыехаў, апрануўшы пад святочнае адзенне кальчугу, і з вялікаю аховай. На наступны дзень прыхільнікаў князя пазбівалі на вечы, а сам Расціслаў з дружынаю ўцёк і «многа зла створи волости Полотьской, воюя и скоты и челядь». Цяжка сказаць, якой была тут пазіцыя Ефрасінні, але аўтарытэт, што мела на той час князёўна-ігумення, дазваляе прылічыць яе хутчэй да аўтараў ліста князю Рагвалоду-Васілю.

У тагачаснай складанай палітычнай сітуацыі Полацк спачатку ўваходзіць у саюз са Смаленскам, затым змагаецца супроць нядаўніх хаўруснікаў з дапамогаю Чарнігава. Міжусобная барацьба полацкіх князёў працягваецца з пераменным поспехам. Вялізныя ахвяры прынесла ў 1162 годзе бітва Рагвалода з Валадаром. Пад 1167 годам летапіс гаворыць пра тое, што менскаму князю Валадару ўдалося ненадоўга захапіць Полацк. Улетку 1168 года паход на Полацкае княства зрабілі наўгародцы — «пожгоша волость» и «воротищаяся от города за 30 верст». Патрыётка сваей зямлі, Ефрасіння не магла не прымаць яе нягодаў блізка да сэрца. «Жыціе» паведамляе, што яна «ни хотяше видети никого же которающася**: ни князя со князем, ни бояри с бояриной, ни служанина со служанином — но всех хотяше имети, яко едину душю».

У апошняе дзесяцігоддзе жыцця асветніцы ў Полацку княжыў Усяслаў Васількавіч. Ефрасіння, безумоўна, параўноўвала гэтага князя са сваім славутым дзедам, яго аднайменнікам. Лёгка здагадацца, што параўнанне было не на карысць Усяслава II. І ўсё ж яму, пэўна, не без дапамогі князёўны-ігуменні, удаецца прыцішыць міжусобныя спрэчкі Рагвалодавічаў (у канцы княжання Усяслава Васількавіча шэсць полацкіх князёў бралі ўдзел у паходзе на Друцк, дзе сядзеў смаленскі стаўленік). Магчыма, якраз адносны спакой у Полацкай зямлі паўплываў на рашэнне Ефрасінні зрабіць паломніцтва ў Ерусалім.

Асветніца, вядома, добра разумела, што спакой гэты часовы, і на змену яму прыдуць новыя войны, вынікі якіх могуць быць катастрафічнымі. Мы ўжо адзначалі тоеснасць ідэй знакамітай палачанкі і аўтара «Слова пра паход Ігаравы».

> Князевы міжусобіцы — згуба
> для нас ад паганых. Казаць стаў
> брат брату: «гэта мае і тое ж
> маё!»
>
> Яраслаўле і ўсе ўнукі Усеслаўлевы! Апусціце ўжо сцягі свае!
> Пахавайце мячы свае пашчарбаныя!
> Вы бо сваімі нязгодамі пачалі
> наводзіць паганых на Рускую
> зямлю, на надзел Усяслава, ад
> чаго і насілле пайшло ад зямлі
> Палавецкай.*

Паміж смерцю асветніцы і нараджэннем выдатнага твора нашай старажытнай літаратуры прайшло каля пятнаццаці гадоў, але мы маем поўнае права сцвярджаць, што такія думкі маглі належыць і Ефрасінні.

* *Захапіўшы, аддамо табе ў рукі.*
** *У стане варожасці.*

* *Празаічны пераклад Янкі Купалы.*

# НАВЕЧНА Ў ПАМЯЦІ НАШЧАДКАЎ

*Вабіць вобраз асветніцы * У Полацку праз восем стагоддзяў * Пад скляпеннямі Сафіі * Сенсацыйная знаходка * «Зверым душу па палачанцы!»*

Незвычайны лёс Ефрасінні, самаадданае служэнне роднай зямлі, якое ўзняло знакамітую палачанку высока над сваёй эпохай, прыцягваюць не толькі вучоных-гісторыкаў.

Пісьменніца Вольга Іпатава стварыла вобраз асветніцы ў гістарычнай аповесці «Прадслава», дзе жыццё нашай зямлячкі паказана на фоне яе драматычнага і супярэчлівага часу. Экскурс у Полацк XII стагоддзя робіць у рамане «Святыя грэшнікі» адзін са старэйшых беларускіх празаікаў Алесь Асіпенка. Ефрасінні і яе славутым сучаснікам і паплечнікам дойліду Іаану і майстру-ювеліру Лазару Богшу прысвяцілі свае вершы, паэмы, апавяданні Алесь Разанаў, Данута Бічэль-Загнетава, Таіса Бондар, Ларыса Геніюш, Наталля Арсеньева, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Ірына Багдановіч, Сяргей Сокалаў-Воюш, Алег Мінкін, Пятро Ламан, Навум Гальпяровіч, Сяргей Тарасаў.

Асоба асветніцы вабіць да сябе і сучасных мастакоў. Іканаграфія Ефрасінні (гаворка ідзе не пра царкоўную іканаграфію) налічвае ўжо некалькі дзесяткаў твораў. Сярод іх вылучаюцца палотны вядомых беларускіх жывапісцаў Аляксея Марачкіна і Нінэль Шчаснай, графічныя аркушы Арлена Кашкурэвіча. У тэхніцы габелена партрэт Ефрасінні Полацкай стварыў Сымон Свістуновіч. Яе імя ўзнікае ў памяці пры знаёмстве з адухоўленымі жаночымі вобразамі старажытных палачанак скульптара Алеся Шатэрніка. Частка названых вышэй твораў увайшла ў экспазіцыю Полацкай карціннай галерэі, якая дзейнічае ў колішнім Багаяўленскім саборы.



Каб глыбей зразумець выдатнага чалавека, трэба абавязкова пабыць у яго на радзіме. У велічным Сафійскім саборы, дзе восем з паловаю стагоддзяў таму Ефрасіння «нача книгы писати своими руками», цяпер канцэртная зала з арганам, а таксама музейная экспазіцыя, якая знаёміць з археалагічнымі знаходкамі, выяўленымі ў часе даследаванняў старажытнага Полацка. У ахоўную зону Полацкага гістарычна-археалагічнага запаведнікаў уключаны і архітэктурны комплекс Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. З кожным годам яго наведвае ўсё больш турыстаў з нашай краіны і з-за мяжы. Экскурсанты маюць магчымасць пачуць расказ пра жыццёвы і творчы подзвіг асветніцы, агледзець пабудаваны па яе заказе Спаскі храм, убачыць фрагменты фрэсак XII стагоддзя, адна з якіх, верагодна, з'яўляецца выяваю самой Ефрасінні. Калі пашанцуе, можна падняцца і на хоры, у келлю, дзе жыла асветніца. Мяркуецца, што неўзабаве будзе адноўлены першапачатковы выгляд Спаскай царквы і праведзена рэстаўрацыя яе ўнікальных фрэсак. Задача захавання размалёвак стаіць асабліва востра, бо ў апошнія гады фрэскі хутка самараскрываюцца і разбураюцца. У 1989 годзе ў храме распачала працу група мастакоў-рэстаўратараў на чале з Уладзімірам Ракіцкім.

Нядаўна полацкая газета «Сцяг камунізму» пазнаёміла чытачоў з перспектыўным планам ушанавання памяці дзеячаў беларускай гісторыі і культуры, жыццё і чыннасць якіх звязаныя з «бацькам гарадоў беларускіх». Гэты план прадугледжвае, у прыватнасці, стварэнне мемарыяльных знакаў і помнікаў знакамітым продкам асветніцы — першаму летапіснаму полацкаму князю Рагвалоду, Рагнедзе, князям Ізяславу і Усяславу Брачыславічу Чарадзею. Плануецца і адкрыццё помніка Ефрасінні Полацкай *. Ён мог бы цудоўна ўштукавацца ў архітэктурна-ландшафтную прастору Спаса-Ефра-

* *Сцяг камунізму. 1989. 23 жніўня.*

сіннеўскага манастыра або Верхняга замка. Актуальнай застаецца праблема стварэння ў Полацкім краязнаўчым музеі адмысловай экспазіцыі, прысвечанай жыццю і дзейнасці Ефрасінні. Імя славутай палачанкі не павінны абыходзіць маўчаннем таксама Беларускі дзяржаўны, Віцебскі абласны краязнаўчы і іншыя музеі рэспублікі.

У дні святкавання 1125-годдзя Полацка адбылася незвычайная і сімвалічная падзея, звязаная з імем асветніцы. Пад скляпеннямі Сафійскага сабора, дзе калісьці знайшла прытулак юная Ефрасіння, прагучаў музычны цыкл, створаны ў яе гонар у XII стагоддзі. Цяжка было дапусціць магчымасць існавання такога ранняга музычнага помніка. Аднак ленінградскай даследчыцы Н. С. Сярогінай пашчасціла знайсці і атрыбутаваць старажытныя тэксты і ноты. Яна ж пакуль што застаецца адзінай выканаўцаю гэтых спеваў, якія ўзніклі каля вытокаў нашай нацыянальнай культуры. Спеўны цыкл пра Ефрасінню Полацкую і сваімі словамі, і старажытнай мелодыяй пакідае глыбокае і непаўторнае ўражанне. Трэба спадзявацца, што ён будзе запісаны на пласцінку і стане здабыткам усіх аматараў старажытнай музыкі.

Каштоўная знаходка Н. С. Сярогінай дае надзею, што гісторыкаў, якія даследуюць дзейнасць асветніцы і яе эпоху, чакаюць новыя адкрыцці ў старажытных сховішчах.

Псторыя — не ўласнасць нейкае касты. Яна — бясцэнны духоўны скарб усяго народа, які ўсё больш рашуча заяўляе пра сваё жаданне ведаць поўную праўду пра мінулае. Сёння ў гістарычнай памяці беларусаў аднаўляюцца забытыя імёны, здабыткам шырокага чытача робяцца літаратурныя помнікі, вядомыя раней вузкаму колу спецыялістаў. Усцешлівы факт гэтага складанага, але няўхільнага працэсу — публікацыя перакладу «Жыцця Ефрасінні Полацкай» на беларускую мову ў першым нумары новага рэспубліканскага часопіса «Спадчына».

Скончыць кнігу хочацца радкамі нашай вядомай паэтэсы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Дануты Бічэль-Загнетавай з яе паэмы «Ефрасіння Полацкая»:



Сілай духоўнай узвысіла Полацк высока.
Тым, хто імкнуўся да кнігі,
свяціла, бы зорка...
Мове, адзінай дзяржаве
шчэ толькі злучацца —
свет нас прымаў як народ
па адной палачанцы.

Як маладзік, узышла, засвяцілася шчыра
па-над вайной,
рассявальніцай цемры на шлях.
Унучка змаганца асветніцкі выбрала выра
Павандравала...
Як маладзік, узышла...

Сталыя, моладзь!
Да слова пара падключацца
з поўнай напругай!
Даволі ўзаемных абраз!
Зверым душу па натхняльніцы,
па палачанцы!
Душу ўздымае духоўна
жаночы абраз.

# ЗМЕСТ

ПРАДМОВА . . . . . . . . . . 5

КАЛЫСКА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ . . . . 9

*Полацкая дзяржава • Бацька гарадоў нашых • Асяродак кніжнае навукі • Памяткі даўніны • Адметнасць полацкай культуры*

СТАРОНКІ ЖЫЦЦЯ . . . . . . . . 13

*Унучка Усяслава • Гісторыя ў сямейных паданнях • У бацькоўскім доме • Хрыстова нявеста • Уступка султана Саладзіна • Апошняе падарожжа • Легенда пра князёўну Праксэду*

ПОЛАЦКАЯ КНІЖНІЦА . . . . . . . 19

*Не толькі Біблія • Візантыйскія хронікі і айчынныя летапісы • «Шасцідзёны», «Фізіялог» і «Хрысціянская тапаграфія» • Прырода як храм служэння • Неартадаксальныя трактаты • Ці чытала асветніца Арыстоцеля? • Ефрасіння і аўтар «Слова» • Цяжкая праца перапісчыка • Каму ішлі лісты з Полацка? • Што такое скрыпторый. • Агмені асветы • У манастырскай школе • «Юныя учаше чистоте душевней» • Урокі красамоўства • Жорсткасць ці паслядоўнасць?*

Асновы светапогляду Ефрасінні . . . . . 19

Схіліўшыся над пергаменам . . . . . . 25

«Аз, букі, ведзі...» . . . . . . . . 27

Сёстры-паплечніцы . . . . . . . . 29

ЗБІРАЛЬНІЦА ТАЛЕНТАЎ . . . . . . 31

*«Приставник над делатели церковными» • Ідэал прыгажосці і гармоніі • Палачане будуюць у Смаленску і Ноўгарадзе • У фондах Рускага музея • Адысея Полацкай Адзігітрыі • Размалёўкі Спаскай царквы • Чыё аблічча на фрэсцы? • Шэдэўр ювелірнага мастацтва • Пра што расказаў старажытны надпіс • Калі не дапамагаюць закляцці • Сляды вядуць за акіян*

Узлёт полацкага дойлідства . . . . . . 31

Старажытныя вобразы . . . . . . . 35

Крыж Лазара Богшы . . . . . . . 38

У ГУШЧЫНІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ . . . 44

*Пра што маўчыць «Жыціе» • Сцяг незалежнасці • Крывавы вір усобіц • «Всех хотяше имети, яко едину душю» • З думай пра будучыню Радзімы*

НАВЕЧНА У ПАМЯЦІ НАШЧАДКАЎ . . . . 48

*Вабіць вобраз асветніцы • У Полацку праз восем стагоддзяў • Пад скляпеннямі Сафіі • Сенсацыйная знаходка • «Зверым душу па палачанцы!»*

НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ
Серыя акадэмічная

Научно-популярное издание

**Орлов Владимир Алексеевич**

**ПРОСВЕТИТЕЛЬНИЦА ИЗ РОДА ВСЕСЛАВА:**
ЕФРОСИНИЯ ПОЛОЦКАЯ

Минск, издательство «Навука і тэхніка»

*На белорусском языке*

Навукова-папулярнае выданне

**Арлоў Уладзімір Аляксеевіч**

**АСВЕТНІЦА З РОДУ УСЯСЛАВА.**
ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

Загадчык рэдакцыі *М. Дз. Гесь*
Рэдактар *Л. А. Коржава*
Мастак *Т. П. Кулажэнка*
Мастацкі рэдактар *А. А. Кулажэнка*
Тэхнічны рэдактар *С. А. Курган*
Карэктар *А. В. Добыш*

ІБ № 3737

Здадзена ў набор 13.07.89. Падпісана ў друк 04.11.89. АТ 13166. Фармат 84X100$^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 2,73+0,78 укл. на мял. пап. Ум. фарб.-адб. 3,53. Ул.-выд. арк. 2,98. Тыраж 11000 экз. Цана 20 к. Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук БССР і Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220072. Мінск, Ленінскі праспект, 68. Друкарня імя Францыска Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220072. Мінск, Ленінскі праспект, 68.

KAMUNIKAT.org